Аддзел адукацыі Кобрынскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына»

# Работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры як сродак фарміравання чытацкай граматнасці вучняў



Кобрын
2024

**Складальнік:**
**Валошчык Т. С.,** настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына»
**Рэцэнзент:**
**Кірылюк Г. П**., намеснік дырэктара Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 7 г. Кобрына»

У зборнік увайшлі матэрыялы з вопыту работы з тэкстам у якасці сродка фарміравання чытацкай граматнасці вучняў 7-9 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацы. Тут дадзены прыклады пытанняў і заданняў да тэкстаў, накіраваныя на фарміраванне і дыягностыку сфарміраванасці чытацкай граматнасці вучняў. Акрамя таго, прыведзены прыклады выкарыстання такіх заданняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры для кантролю вывучанага матэрыялу, замацавання тэарэтычных пытанняў, павышэння пісьменнасці і культуры мовы.

Адрасавана настаўнікам беларускай мовы і літаратуры.

ЗМЕСТ

Уводзіны……………………………………………………………………..4
Работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры
як сродак фарміравання чытацкай граматнасці вучняў ……………………5
Планы-канспекты ўрокаў…………………………………………………….13
Урок па тэме «Поўная і кароткая формы дзеепрыметнікаў»……………13
Урок па тэме «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага
па тэме «Прыслоўе»…………………………………………………………18
Урок па тэме «Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку»…….25
Урок па тэме «Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак» ………..36
Урок па тэме «Правілы пабудовы складаназалежных сказаў,
знакі прыпынку»……………………………………………………………...43
Дадатак 1. Заданні да твора У. Караткевіча «Паром на бурнай рацэ»……50
Дадатак 2. Заданні да твора Якуба Коласа «Хмарка”. ……………………54
Дадатак 3. Заданні да твора Г. Далідовіча «Губаты»………………………56
Дадатак 4. Заданні да твора Тараса Хадкевіча «Крынічка»………………61
Дадатак 5. Заданні да тэксту «Людская ўдзячнасць»……………………...63
Дадатак 6. Заданні да тэксту «Прытча»……………………………………64
Дадатак 7. Заданні да тэксту «Заданні да тэксту «Я з вогненнай вёскі»...65
Дадатак 8. Творчыя работы вучняў. Сачыненні па малюнку
з выкарыстаннем фрагмента тэксту «Бліны»……………………………67
Дадатак 9. Творчыя работы вучняў……………………………………….69
Заключэнне ………………………………………………………………...72
Спіс літаратуры………………….………………………………………..73

## Уводзіны

Адной з самых важных умоў паспяховага навучання падлеткаў у школе з'яўляецца ўменне чытаць і разумець прачытанае. На жаль, многія вучні не валодаюць такім важным універсальным дзеяннем, як чытанне. Чаму гэта адбываецца? Для такіх абставін у сучасным свеце вялікая колькасць прычын: даступны інтэрнэт, разнастайныя гаджэты, вечнае імкненне людзей атрымаць патрэбнае за кароткі час і без асаблівых намаганняў - лянота. Што ж рабіць? Дзе выйсце? Як навучыць дзяцей не проста агучваць літары, сабраныя ў словы, а ўдумвацца, разважаць, развівацца… З дапамогаю якіх сродкаў навучыць новае пакаленне паўнавартасным зносінам з сабе падобнымі? Вельмі важна, калі чалавек хутка і правільна арыентуецца ва ўмовах зносін, умее спланаваць сваю прамову, знайсці адэкватныя сродкі перадачы сваіх думак і атрымаць зваротную сувязь.

У межах інавацыйнага праекта «Увядзенне мадэлі фарміравання чытацкай граматнасці вучняў II ступені агульнай сярэдняй адукацыі» я звярнула сваю ўвагу менавіта на работу з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры у якасці сродку фарміравання чытацкай граматнасці вучняў. На мой погляд, менавіта работа з тэкстам дае магчымасць накіроўваць дзейнасць школьнікаў на выпрацоўку практычных навыкаў пісьмовага і вуснага маўлення.

На падрыхтоўчым этапе сваёй працы пазнаёмілася з тэарэтычнымі матэрыяламі па дадзенай тэме. А потым пачалася тая ж праца, якую праводзіла раней, бо тэкст – асноўны кампанент структуры падручніка па беларускай мове і літаратуры, праз які рэалізуюцца ўсе мэты навучання ў іх комплексе: адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая.

Прапанаваны матэрыял накіраваны як на фарміраванне чытацкай граматнасці вучняў, так і на рэалізацыю выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў. Змест і формы правядзення ўрокаў прадугледжваюць уключэнне вучняў у розныя віды дзейнасці, выкананне імі разнастайных заданняў, накіраваных на аналіз жыццёвых сітуацый, з мэтай перайманне арыенціраў для ўласных паводзін у розных жыццёвых абставінах.

Спадзяюся, што матэрыялы, змешчаныя ў зборніку, будуць карыснымі для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

## Работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры

**як сродак фарміравання чытацкай граматнасці вучняў**

Тэкст – асноўны кампанент структуры любога падручніка. Выкладчыкі школьных прадметаў сутыкаюцца з адной і той жа праблемай: некаторыя вучні няўважліва чытаюць нават невялікага памеру тэксты, часта пры чытанні прапускаюць важныя зместавыя факты, з цяжкасцю выдзяляюць асноўнае.

На ўроках беларускай мовы і літаратуры існуюць такія ж праблемы. Аднак кожны настаўнік разумее, што чытацкая дзейнасць на сучасным этапе з'яўляецца не толькі адной з важных форм сацыялізацыі асобы, далучэння яе да сацыяльнага вопыту чалавецтва, але і сродкам разумовай працы, пазнання, чалавечых стасункаў і духоўнага развіцця. Чытацкая дзейнасць пераўтвараецца ў непасрэдную вытворчую моц інтэлектуальнага і духоўнага развіцця чалавека і чалавецтва цалкам. Менавіта таму развіццю чытацкай граматнасці надаецца вялікая ўвага.

Існуюць разнастайныя спосабы, прыёмы і сродкі вырашэння гэтай праблемы. Адным з дзейсных сродкаў фарміравання чытацкай граматнасці вучняў з'яўляецца тэкст. Пры рабоце з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры можна адпрацаваць з вучнямі ўменні адрозніваць разнастайныя лексічныя адзінкі, вызначаць марфалагічныя і фанетычныя асаблівасці слоў, можна навучыць дзяцей рабіць вынікі на яго аснове, параўноўваць прачытанае з тым, што чыталі раней, і са сваім жыццёвым вопытам.

Для таго, каб на ўроках беларускай літаратуры тэксты былі засвоены паспяхова, прамяняюцца разнастайныя прыёмы: «Лаві памылку», «Так ці не», «Карэктар», «Веру - не веру», «Ці верыце вы, што…?», «Кругавы пераказ», «Тоўстыя і тонкія пытанн»і, «Фішбон», «Чытанне са сцікерамі» і г. д. Прыкладамі заданняў, якія дапамагаюць вучням уважліва чытаць твор, застаўляюць неаднаразова звярнуцца да яго, могуць быць карткі «Пазнай героя», «Пазнай героя па рэпліцы», «Устаў прапушчаныя словы», распрацаваныя да твораў У. Караткевіча «Паром на бурнай рацэ» (дадатак 1), Я. Коласа «Хмарка» (дадатак 2). Напрыклад:

| **Картка 4.**<br>**Устаў прапушчаныя словы.** | |
|---|---|
| **1.** На левы, процілеглы гораду бераг Дняпра 1____выслаў роту выпрабаваных у баях салдат пад камандай капітана 2____.<br>**2.** Капітану не вельмі верылі як нашчадку сепаратысцкай фаміліі і ўраджэнцу ______. | **А.** Юрый Гораў<br>**Б.** Пора-Леановіч<br>**В.** Фікельмонт<br>**Г.**Усяслаў Грынкевіч<br>**Д.** Іван |

| | |
|---|---|
| **3.** Таму « ў дапамогу яму » і на «адпачынак» паставілі таксама капітана _______ карэннага русака са старой маскоўскай фаміліі.<br>**4.** _______быў ранены ў сутычцы з атрадам паўстанцаў пад Ракавам і адасланы «ў тыл».<br>**5.** У канцы ліпеня __________даў загад знішчыць на Дняпры ўсе чаўны.<br>**6**. Кіраўнік атрада _______ быў узяты ў палон і асуджаны на смерць.<br>**7.** 18 жніўня на кардон прыляцеў улан на ўспененым кані і нешта хутка перадаў ________.<br>**8.** ________пераправіў конніка на другі і са шкадобаю глядзеў, як жывёла, амаль па-чалавечы стогнучы, выносіла ўлана на стромы чырвоны адхон.<br>**9.** Маменька, пэўна, паехала цяпер у манастыр, маліцца за здравіе _____і каб Бог дараваў яму веру.<br>**10.** А вось і сам ён, _____, выходзіць з парадных дзвярэй, праходзіць дарожкай пад ліпамі, з насалодаю дыхаючы празрыстым і ўжо схаладнелым паветрам. | |

**КАРТКА 1.**

**Пазнайце герояў твора. Устаўце прапушчаныя словы.**

**1.** Можа, затым _______ і была такая шчаслівая, што нічога не ведала аб белым свеце.

**2.** Яна не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна; не ведала нават, ці ёсць у яе____.

3. У_______, відаць, было нейкае свята ў гэту раніцу, або добра нагуляўся ён дзе за ўчарашні дзень, бо яшчэ не варушыўся і спаў, хоць сонейка падбіралася пад поўдзень.

4. Даўганосы ______ і вухам не вёў на плявузготу сярдзітай суседкі, а любоўна цешыўся са сваіх дзетак.

5. І паплыла паволі ________ ў далёкую-далёкую дарогу, дзе застанаўляючыся, як прыемная думка, дзе кіруючыся на малюнкі, што найбольш зацікаўлялі яе.

6. ________ перасталі спяваць і пахаваліся пад лісток лотаці. Гэта яны спявалі песню ў гонар Хмаркі, а яна так зняважыла іх.

7. Там ________ выплакалі апошнія слёзы, каб даць табе жыццё.

8. — Адкуль прыпаўзла, нябога? — спытала _________ Хмарку.

9. — Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы, — сказаў __________на гутарку Хмаркі. — Быў і я ў тых краях, адкуль прыблуталася імасць. Там, гаворыш, — шчасце? А што ж, па-твойму, няшчасце?
10. Стары _________, абмыўшыся дажджом, павесялеў і сказаў да Бусла, з якім даўно ўжо быў у дружбе: — От навука для тваіх дзяцей…

Заўважана, што вучням значна цікавей працаваць з матэрыяламі, на якіх ёсць малюнак, таму для работы з тэкстамі на ўроках беларускай літаратуры распрацаваны карткі з наступнымі заданнямі:

- размясціць нумары малюнкаў у такім парадку, у якім гэтыя эпізоды ідуць у тэксце;
- знайсці ў тэксце ўрывак, які адпавядае малюнку. Выразна зачытаць яго.

Прыкладамі такіх заданняў з'яўляюцца карткі, распрацаваныя да твора Генрыха Далідовіча «Губаты» (дадатак 3).

**Картка 9.**
**Размясці нумары малюнкаў у такім парадку, у якім гэтыя эпізоды ідуць у тэксце.**

| | | |
|---|---|---|
| 1.  | 2.  | 3.  |
| 4.  | 5.  | 6.  |

У працэсе работы з тэкстамі на ўроках літаратуры важна навучыць дзяцей назіраць за героямі. Для гэтага неабходна па тэксце прасачыць за развіццём персанажаў, за тым, як яны сябе паводзяць у розных абставінах, як ўзаемадзейнічаюць з іншымі героямі. Важна ўбачыць адносіны да

персанажа і самога аўтара, прааналізаваўшы тыя спосабы, з дапамогаю якіх пісьменнік паказвае нам героя. Тут без уважлівага прачытання не абысціся, таму мэтазгодна выкарыстоўваць заданні наступнага характару (дадатак 2):

| **Картка 8.**<br>Папрацуйце з тэкстам. Паназірайце, якая Хмарка ў пачатку і ў канцы тэксту. Якія словы для характарыстыкі гераіні выкарыстоўвае аўтар? Запішыце свае назіранні. Зрабіце вывад: як змянілася гераіня? Чаму? | |
|---|---|
| У пачатку твора | У канцы твора |
| | |

Акрамя таго, можна выкарыстоўваць комплексныя работы для ўзнаўлення зместу таго ці іншага тэксту. Прыкладам такога задання з’яўляецца распрацоўка да твора Т. Хадкевіча «Крынічка» (дадатак 4).

Такая работа з тэкстамі дазваляе не толькі навучыць дзяцей удумліва чытаць, звяртаць увагу на герояў, асаблівасці іх характару, іх развіцця. Задачы стаяць значна большыя. Так, напрыклад, вельмі важнай з’яўляецца работа па ўзбагачэнні лексічнага запасу школьнікаў. Для гэтага можна выкарыстаць наступныя заданні:

| **Картка 2.**<br>Уважліва прачытай словы ў левым слупку, знайдзі іх значэнне ў правым слупку. Спалучы словы з іх значэннем. Адказ запішы спалучэннем лічбаў і літар: 1А, 2Б, 3В і г.д. | |
|---|---|
| **1.** Гарыпні | **А.** Салдат або афіцэр коннай арміі. |
| **2.** Брэцёр | **Б**. Заўзяты дуэлянт. |
| **3.** Душагубка | **В.** Рыбалоўная прылада. |
| **4.** Улан | **Г.** Старое перасохлае рэчышча. |
| **5.** Аказія | **Д.** Гульня; назва ад прыпеву «Гары-гары, пень». |
| **6.** Сепаратыст | **Е**. Не ваенны, грамадзянскі. |
| **7.** Старык | **Ж.** Вузкая, няўстойлівая лодка. |
| **8.** Нерат | **З.** Развязнасць, беспрынцыповасць. |
| **9**. Фамільярнасць | **І.** Зручны выпадак для якой-небудзь справы |
| **10.** Цывільны | **К.** Прыхільнік адасаблення нацыянальнай меншасці. |

Калі вучань ужо добра працуе з тэкстам, умее бачыць і не прапускаць у ім самае значнае, тады ён гатовы рабіць высновы, становіцца больш засяроджаным, удумлівым. На такім этапе важна даць яму магчымасць праявіць сябе, сваё «Я». Тады на дапамогу прыходзяць творчыя заданні, у якіх дзецям можна прапанаваць напісаць працяг твора, стварыць для героя ўяўную старонку ў сацыяльных сетках або паразважаць пра вечнае:



**Картка 5.**
**Паразважайце на тэму:** ***«Не лётайце дарэмна па свеце, не бадзяйцеся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага».***

**Картка 6.**
**Паразважайце на тэму:** ***«Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі».***



Работа з тэкстам шматпланавая і разнастайная. Каб вучань добра разабраўся са зместам, патрэбны не толькі вышэйпералічаныя падыходы. Важна навучыцца вызначаць тэму, асноўную думку, падбіраць свае загалоўкі да тэкстаў, складаць іх планы, шукаць і пераказваць пэўныя эпізоды, правільна фармуляваць свае думкі, задаваць адзін аднаму пытанні… І калі спачатку многія заданні здаюцца цяжкімі, за выкананне творчых заданняў, бывае, некаторыя вучні нават не бяруцца, то з часам усё становіцца прасцейшым, тэксты адкрываюцца ў поўнай меры, героі становяцца запамінальнымі і любімымі, а магчымасць пафантазіраваць, выказаць сваё меркаванне і паразважаць не пужае, а акрыляе (дадатак 9).

Што датычыцца работы з тэкстамі на ўроках мовы, то тут поле дзейнасці таксама шырокае. У падручніках дастаткова разнапланавых матэрыялаў, што дапамагае вырашыць задачы развіцця чытацкай граматнасці вучняў у поўнай меры.

У першую чаргу хочацца звярнуцца да тэкстаў навуковага стылю, да тэарэтычных матэрыялаў. Работа з імі заўсёды вельмі адказная. Калі настаўнік з’яўляецца звычайным транслятарам новай інфармацыі, вучням не заўсёды цікава. Таму з некаторымі матэрыяламі на першым этапе азнаямлення лепш працаваць індывідуальна. І толькі тады, калі аснова заложана, вучню можа спатрэбіцца дапамога настаўніка, каб скарэкціраваць некаторыя моманты, растлумачыць незразумелыя пункты. У рабоце з такімі тэкстамі можна выкарыстоўваць табліцы, кластары, канспекты (план-канспект урока «Поўная і кароткая формы дзеепрыметнікаў»).

На ўроках беларускай мовы неабходна арганізоўваць работу з тэкстам як з асноўнай лінгвадыдактычнай адзінкай, тым самым імкнуцца накіроўваць дзейнасць школьнікаў на выпрацоўку практычных навыкаў пісьмовага і вуснага маўлення. Але не менш важны выхаваўчы аспект матэрыялу. І такіх тэкстаў у падручніках дастаткова. Хочацца звярнуць увагу на тэкст, што змешчаны ў вучэбным дапаможніку для 7 класа

«Беларуская мова» (Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская). На ўроку дзецям спачатку даецца заданне прачытаць тэкст па падручніку (без прабелаў), а працаваць ўжо можна прапанаваць са змененым варыянтам гэтага матэрыялу:

**Тэкст**

[1]Як вядома, медаль у чалавечым грамадстве не *з..яўляецца* актам поўнага прызнання заслуг. [2]Поўнае і *а..салютнае* прызнанне —гэта помнік. [3]Помнікі ва ўсім *с..веце* ставяць не толькі людзям, але і жывёлам.

[4]У італьянскім горадзе Борга-Сан-Ларэнца пастаўлены помнік *сабак..* . [5]Ён заўсёды сустракаў гаспадара на аўтобусным прыпынку. [6]Аднойчы той не прыехаў (здарыўся *ня..часны* выпадак). [7]Сабака не мог зразумець гэтага і хадзіў да аўтобуснага прыпынку некалькі гадоў запар. [8]Калі сабакі не стала, жыхары горада сабралі грошы і паставілі помнік сабачай вернасці. [9]Помнік маламуту па мянушцы Бальт устаноўлены аж у двух месцах: у парку Нью-Ёрка і ў аляскінскім горадзе Норм. [10]Так былі прызнаны заслугі сабакі за дастаўленую вакцыну, што выратавала ад эпідэміі дыфтэрыі дзяцей гэтага паўночнага *гара..ка*.

[11]У *а)Пецярбург..* па патрабаванні акадэміка І. Паўлава ў 1935 годзе быў *б)а..крыты* помнік сабаку. [12]Ён стаіць на *а)тэ..ыторыі* Інстытута эксперыментальнай *б)мед..цыны* і *в)све..чыць* пра ўдзячнасць вучоных жывёлам- сваім маўклівым *г)памо..нікам (Паводле А. Ханіна)*.

Тут для работы ёсць вялікае поле дзейнасці. Гэта структура тэксту, яго прыметы, лексіка, марфалогія, арфаграфія. (Да тэксту прапануецца распрацаваны комплекс заданняў. Дадатак 5.) Да таго ж, неабходна звярнуць увагу на выхаваўчы аспект матэрыялу. Павага да прыроды, да жывых істот павінна выхоўвацца ў падлеткаў. Больш таго, тэкст дае магчымасць настаўніку зацікавіць вучняў гэтай тэмай, даведацца, ці ёсць тыя, хто ведае пра існаваннне помнікаў іншым жывёлам, пашырыць веды тых, хто яшчэ не сутыкаўся з гэтым пытаннем.

Асаблівую цікавасць выклікаюць тэксты філасофскага зместу. На іх прыкладзе дзеці вучацца разважаць, бачыць за звычайнымі рэчамі, словамі незвычайнае, вучацца шукаць і адчуваць падтэкст. Гэта, безумоўна, спрыяе іх развіццю і маральнаму росту. У якасці прыкладу можа служыць наступны тэкст, да якога прапануецца распрацаваны комплекс заданняў (дадатак 6):

**Прытча**

[1]Адзін чалавек, які ўц..леў пасля *карабле(крушэння)*, быў выкінуты хваляй на бязлюдны востраў. [2]Штодня ён узіраўся ўдалячынь і чакаў, што міма праплыве *які(небудзь)* карабель і выратуе яго.

[3]Але дні ішлі, а гарызонт быў пусты. [4]Чалавек вырашыў збудаваць <u>с..бе</u> *(не)вялікі* шалаш з уцалелага ад карабля бярвення, каб абараніцца ад дажджу і звяроў.

[5]Аднойчы ён вярнуўся пасля пошукаў ежы і ўбачыў шалаш <u>а..утаны</u> полымем. [6]Дым уздымаўся слупам да самага неба. [7]Разам з шалашом былі страчаны ўсе яго запасы. [8]Чалавек застаўся ні з чым. [9]Ахоплены <u>а..чаем</u> ён чакаў смерці.

[10]А раніцай наступнага дня яго пабудзіў карабельны гудок.

— [11]Як вы даведаліся, што я тут? — спытаў чалавек у матросаў.

— [12]Мы ўбачылі твой дымавы сігнал, — <u>а..казалі</u> яны.

[13]Памятай чалавек: калі раптам твой маленькі шалаш згарыць дашчэнту, гэта можа быць сігналам для твайго выратавання.

Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую – асабліва цяжкая, але і цікавая работа. Гэта своеасаблівы мазгавы штурм для вучняў. Тут неабходна адразу засяродзіцца, бо настаўнік абавязкова акцэнтуе ўвагу на тым, што патрэбна не толькі ўспомніць пэўныя словы, але і звярнуць увагу на своеасаблівасць канструкцый, на формулу пабудовы сказаў. Трэба ўлічваць адразу шмат аспектаў і не забыць пра творчы падыход да гэтай справы. (Прыклад работы з тэкстам для перакладу можна ўбачыць у адным з фрагментаў урока «Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Прыслоўе».)

Цікавай атрымліваецца работа з тэкстамі практычнага накірунку. Для прыкладу возьмем наступны матэрыял:

**Бліны**

Як прыгатаваць блінцы? Для гэтага трэба ўзяць неабходныя ігр..дыенты:

- малако - 660 мл.;
- яйка - 2 шт .;
- мука - 445 г.;
- **<u>САХАР(                    )</u>**- 10 г.;
- **<u>ПОДСОЛНЕЧНОЕ МАСЛО (                              )</u>** - 45 мл.;
- масла сметанк..вае.
- [1]Ра..біваем яйкі ў місачку ўліваем [2]малако і ўзбіваем мікс..рам. Затым паступова [3]ўсыпаем муку *(прасеяць)* зага(д/дз)я і змеш..ваем. Следам кідаем **<u>сахар(      )</u>** і [4]ўліваем **<u>подсолнечное масло(          )</u>**. [5]Выліваем (т/ц)еста на добра (*разагрэць)* **<u>сковороду(                    )</u>** тонкім пластом і вып..каем бліны з [6]абодвух бакоў. Пас..ля гэтага [7]пераклад..ваем [8]іх на талерку і прамаз..ваем сметанк..вым маслам.

Тут шырокае поле для дзейнасці. Да тэкста падрыхтаваны заданні па арфаграфіі, лексіцы (пераклад выдзеленых слоў на беларускую мову), марфалогіі (правапіс лічэбнікаў). Але асаблівую цікавасць набываюць такія тэксты, калі яны становяцца асноваю для нечага новага. Варта толькі дабавіць карцінку і прапанаваць выканаць творчае заданне:

**Разгледзьце малюнкі.**





Суаднясіце іх з тэкстам пра блінцы. Уявіце, што тэкст агучвае для вас гэты малады чалавек. Ён гуляе ў гульню, у якой выступае ў ролі дарослага чалавека пэўнай прафесіі. Прыдумайце маналог для гэтага героя-аматара сваёй прафесіі. ***(Умова: тэкст пра блінцы ўставіць у маналог.)***

Такія заданні выклікаюць цікавасць, даюць магчымасць дзецям праявіць сябе. Магчыма, што, пазнаёміўшыся з вучнёўскімі работамі, пэўныя адкрыцці зробіць для сябе і настаўнік (дадатак 8).

Міжпрадметныя сувязі – важная ўмова развіцця вучняў. Для таго, каб выклікаць у дзяцей цікавасць да літаратуры, падрыхтаваць іх да пазакласнага чытання, можна прапанаваць тэкст-рэкламу (дадатак 7).

Урокі беларускай мовы і літаратуры – прастора для развіцця культурнай асобы. Менавіта пагэтаму на занятках неабходна звяртаць увагу на свет мастацтва, навукі, спорту, культуры… З дапамогаю тэкстаў і неверагоднай дзіцячай фантазіі можна завочна падарожнічаць па незвычайных месцах нашай краіны, па кантынентах, можна апынуцца нават у космасе. Тэкст мае магчымасць пазнаёміць вучняў з самымі знакамітымі людзьмі, якія пакінулі свой след у гісторыі, адкрыўшы для грамадства нейкі цуд. (Прыклады работы з тэкстамі пра Язэпа Драздовіча, Міхала Клеафаса Агінскага можна знайсці ў распрацоўках урокаў «Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку», «Правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку».)

З дапамогаю тэкстаў можна выхоўваць і ўсебакова развіваць, даючы пры гэтым неабходныя веды па прадмеце. Менавіта пагэтаму работа з

тэкстам – дзейсны сродак у працэсе фарміравання чытацкай граматнасці вучняў.

**План-канспект урока беларускай мовы ў 7 класе**

**Тэма:** “Поўная і кароткая формы дзеепрыметнікаў”

**Мэта:** дапамагчы вучням асэнсаваць утварэнне і ўжыванне кароткай формы дзеепрыметніка, навучыцца вызначаць яе сінтаксічную ролю ў сказе.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання:**

- работа па картках 1, 2;
- праверка практыкавання;
- работа з кластарам на дошцы (кластар на тэму “Деепрыметнік і яго граматычныя прыметы”)

**3. Падрыхтоўка да асноўнага этапа ўрока.**

Праверка работы з кластарам, агучванне тэмы, пастаноўка мэты.

**4. Вывучэнне новага матэрыялу.**

- Практыкаванне 148.
- Работа з тэарэтычным матэрыялам на ст. 87.
- Рубрыка “Звярніце ўвагу!”
- Зварот да кластара, характарыстыка кароткіх дзеепрыметнікаў.

**5. Замацаванне.**

*Практыкаванне 150* (Выканаць па ўзоры, каля дошкі працуюць 4 вучні, кожны разбірае 2 спалуч.):

*1. Дарога абсаджана ліпамі (адз. лік., ж.р.)* *(Выконваецца вусна)*

1 варыянт:
3. Алея сонцам асветлена ( адз. л., ж. р.)
5. Акно адчынена (адз.л., н.р.)
7. Заданне перароблена (н.р., адз. л.)
9. Раман закончаны – м.р.

2 варыянт :
2. Малюнкі выпадкова знойдзены (мн. л.)
4. Абгорнуты сшытак – м.р.
6. Палеткі густа засеяны (мн.л.)
8. Адзенне добра вымыта ( адз.л., н.р.)

*Практыкаванне 154. (Увага на ролю дзеепрыметніка ў сказе. Каля дошкі працуюць 3 вучні.)*

Сшыткі правераны настаўнікам.    Поле засеяна хлебаробамі.
Да дня нараджэння дзяцей бацькамі падрыхтаваны падарункі.

Мастаком напісана новая карціна. Усё наваколле замецена снегам.
Да Новага года ўпрыгожана елачка.

**Фізкультхвілінка**

Раз – падняцца, пацягнуцца.
Два – сагнуцца, разагнуцца.
Тры – у далоні тры хлапкі, галавою тры кіўкі.
На чатыры – рукі шырэй.
Пяць – рукамі памахаць.
Шэсць – на месца ціха сесці.

**6. Праверка ведаў**

*Практыкаванне 152.*

1. Выразнае чытанне тэксту настаўнікам.
2. Самастойнае чытанне тэксту вучнямі.
3. Работа з карткаю (падручнікі закрыць, далей работа будзе праводзіцца па тэкстах, надрукаваных на картках):

**Картка з тэкстам і заданнямі:**

**Прытча**

[1]Адзін чалавек, які ўц..леў пасля *карабле(крушэння)*, быў выкінуты хваляй на бязлюдны востраў. [2]Штодня ён узіраўся ўдалячынь і чакаў, што міма праплыве *які(небудзь)* карабель і выратуе яго.

[3]Але дні ішлі, а гарызонт быў пусты. [4]Чалавек вырашыў збудаваць с..бе *(не)вялікі* шалаш з уцалелага ад карабля бярвення, каб абараніцца ад дажджу і звяроў.

[5]Аднойчы ён вярнуўся пасля пошукаў ежы і ўбачыў шалаш а..утаны полымем. [6]Дым уздымаўся слупам да самага неба. [7]Разам з шалашом былі страчаны ўсе яго запасы. [8]Чалавек застаўся ні з чым. [9]Ахоплены а..чаем ён чакаў смерці.

[10]А раніцай наступнага дня яго пабудзіў карабельны гудок.

— [11]Як вы даведаліся, што я тут? — спытаў чалавек у матросаў.

— [12]Мы ўбачылі твой дымавы сігнал, — а..казалі яны.

[13]Памятай чалавек: калі раптам твой маленькі шалаш згарыць дашчэнту, гэта можа быць сігналам для твайго выратавання.

**Заданні да тэксту**

**Заданне 1.** Уважліва прачытайце тэкст.

**Заданне 2.** Вызначце стыль тэксту.

**Заданне 3.** Вызначце тып маўлення.

**Заданне 4.** У якім сказе выражаецца асноўная думка гэтага тэксту? Назавіце № гэтага сказа.

**Заданне 5.** У якім сэнсе ўжыта слова «шалаш» у апошнім сказе? Растлумачце, якое лексічнае значэнне, на ваш погляд, аўтар надаў гэтаму слову?
**Заданне 6.** Як вы лічыце, што такое прытча?
**Заданне 7.** Запішыце літары, якія прапушчаны ў падкрэсленых словах:
1 сказ - ___; 4 сказ - ___ ; 5 сказ - ___; 9 сказ - ___; 12 сказ - ___.
**Заданне 8.** Раскрыйце дужкі і запішыце выдзеленыя курсівам словы ў той форме, у якой яны стаяць у сказе.
1 сказ - ______________________________;
2 сказ - ______________________________;
4 сказ - ______________________________.
**Заданне 9.** Знайдзіце поўныя дзеепрыметнікі, запішыце іх у той форме, у якой яны пададзены ў тэксце.
**Заданне 10.** Знайдзіце ў тэксце кароткія дзеепрыметнікі, запішыце іх.
**Заданне 11**. Запішыце нумары сказаў, у якіх ёсць парушэнні пастаноўкі знакаў прыпынку пры дзеепрыметнікавым звароце.
**Заданне 12.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з'яўляюцца азначэннем.
**Заданне 13.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з'яўляюцца выказнікам.
**Заданне 14.** Прачытайце сказ № 13. Замяніце яго сваім кароткім (2-3 сказы) павучальным вывадам, звярнуўшыся да аднагодак-сямікласнікаў.

**7. Падагульненне.**
- Якія дзеепрыметнікі маюць поўную і кароткую форму? (Залежнага стану прошлага часу)
- Што можна сказаць пра дзеепрыметнікі мужчынскага роду? (Маюць толькі поўную форму з канчаткам –Ы.)
- Якім членам сказа з'яўляюцца кароткія дзеепрыметнікі? Поўныя?
**8. Рэфлексія.**
**9. Дамашняе заданне** & 25 пр. 157

## Прытча

[1]Адзін чалавек, які ўц..леў пасля *карабле(крушэння)*, быў выкінуты хваляй на бязлюдны востраў. [2]Штодня ён узіраўся ўдалячынь і чакаў, што міма праплыве *які(небудзь)* карабель і выратуе яго.

[3]Але дні ішлі, а гарызонт быў пусты. [4]Чалавек вырашыў збудаваць с..бе *(не)вялікі* шалаш з уцалелага ад карабля бярвення, каб абараніцца ад дажджу і звяроў.

[5]Аднойчы ён вярнуўся пасля пошукаў ежы і ўбачыў шалаш а..утаны полымем. [6]Дым уздымаўся слупам да самага неба. [7]Разам з шалашом былі страчаны ўсе яго запасы. [8]Чалавек застаўся ні з чым. [9]Ахоплены а..чаем ён чакаў смерці.

[10]А раніцай наступнага дня яго пабудзіў карабельны гудок.

— [11]Як вы даведаліся, што я тут? — спытаў чалавек у матросаў.

— [12]Мы ўбачылі твой дымавы сігнал, — а..казалі яны.

[13]Памятай чалавек: калі раптам твой маленькі шалаш згарыць дашчэнту, гэта можа быць сігналам для твайго выратавання.

### Заданні да тэксту

**Заданне 1.** Уважліва прачытайце тэкст.

**Заданне 2.** Вызначце стыль тэксту.

**Заданне 3.** Вызначце тып маўлення.

**Заданне 4.** У якім сказе выражаецца асноўная думка гэтага тэксту? Запішыце № гэтага сказа.

**Заданне 5.** У якім сэнсе ўжыта слова «шалаш» у апошнім сказе? Растлумачце, якое лексічнае значэнне, на ваш погляд, аўтар надаў гэтаму слову?

**Заданне 6.** Як вы лічыце, што такое прытча?

**Заданне 7.** Запішыце літары, якія прапушчаны ў падкрэсленых словах:

1 сказ - ___; 4 сказ - ___ ; 5 сказ - ___; 9 сказ - ___; 12 сказ - ___.

**Заданне 8.** Раскрыйце дужкі і запішыце выдзеленыя курсівам словы ў той форме, у якой яны стаяць у сказе.

1 сказ - ______________________________;

2 сказ - ______________________________;

4 сказ - ______________________________.

**Заданне 9.** Знайдзіце поўныя дзеепрыметнікі, запішыце іх у той форме, у якой яны пададзены ў тэксце.

**Заданне 10.** Знайдзіце ў тэксце кароткія дзеепрыметнікі, запішыце іх.

**Заданне 11**. Запішыце нумары сказаў, у якіх ёсць парушэнні пастаноўкі знакаў прыпынку пры дзеепрыметнікавым звароце.

| |
|---|
| **Заданне 12.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з’яўляюцца азначэннем.<br>**Заданне 13.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з’яўляюцца выказнікам.<br>**Заданне 14.** Прачытайце сказ № 13. Замяніце яго сваім кароткім (2-3 сказы) павучальным вывадам, звярнуўшыся да аднагодак-сямікласнікаў. |

**КАРТКА 1.**

| **Пытанні** | **Суфіксы** |
|---|---|
| **А**. З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу?<br>**Б.** З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыметнікі незалежнага стану прошла часу?<br>**В.** З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыметнікі залежнага стану ад асноў дзеяслова на а, я?<br>**Г**. З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыметнікі залежнага стану ад асноў дзеяслова на зычны або галосныя і, ы, е?<br>**Д.** З дапамогай якіх суфіксаў утвараюцца дзеепрыметнікі залежнага стану ад асноў дзеяслова з аднаскладовым коранем або ад асноў дзеяслова на о,у, ну.<br>**Е.** Якія суфіксы для ўтварэння дзеепрыметнікаў ужываюцца абмежавана або не характэрны для літаратурнай мовы? | 1) –н-,<br>2) -уч-<br>3) -ен-<br>4) -юч-<br>5) -ан-<br>6) -ач-<br>7) -яч-<br>8) -т-<br>9) –л-<br>10) -ўш-<br>11) -ш- |

**КАРТКА 2.** **Утварыце дзеепрыметнікі, абазначце суфіксы.**

| | | |
|---|---|---|
| 1.Паказаць | 2. З’есці | 3.Прынесці |
| 4. Упрыгожыць | 5.Малоць | 6. Апрануць |
| 7.Дагледзець | 8. Зжаць | 9.Пажаўцець |
| 10. Ачысціць | 11.Сагрэць | 12. Перабраць |
| 13.Прачытаць | 14.Размыць | 15.Пабяліць |
| 16. Раскалоць | 17.Зрабіць | 18. Разгледзець |

**Словы для кластара:**

| |
|---|
| ДЗЕЯСЛОЎ |
| ВЫКАЗНІК |
| ЗВАРОТНЫ |
| СПРАЖЭННЕ |
| СТАН |
| ЛАД |

| |
|---|
| ТРЫВАННЕ |
| ЧАС |
| ПРЫМЕТНІК |
| РОД |
| ЛІК |
| СКЛОН |
| АЗНАЧЭННЕ |

| |
|---|
| КАРОТКАЯ ФОРМА |
| ЯКАСНЫ |
| АДНОСНЫ |
| ПРЫНАЛЕЖНЫ |
| ПОЎНАЯ ФОРМА |
| СТУПЕНЬ ПАРАЎНАННЯ |

**АСОБА**

**План-канспект урока беларускай мовы ў 7 класе**

**Тэма:** Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме “Прыслоўе”.

**Мэта:** падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў аб прыслоўі як часціне мовы.

**Ход урока:**

1. **Арганізацыйны момант.**




**Настаўнік. (Сл.1)** Добры дзень, дзеці і паважаныя госці! Я рада вітаць вас на сённяшнім уроку, рада пажадаць вам дабра. Паглядзіце адзін на аднаго, усміхніцеся адзін аднаму, а зараз мне! Малайцы! І так мы пачынаем!

**2. Мэтавызначэнне (Сл. 2)**

**3. Актуалізацыя ведаў:**

**ПРАВЕР СЯБЕ. (Сл. 3)**

***1. Растлумачце сэнс фразеалагізмаў адным словам* (прыслоўем*) (адказы запісаць у сшыткі):***

1. Як кот наплакаў –
2. Хоць вока выкалі –
3. Адным махам –
4. Край свету –
5. Як па заказе –
6. На адзін зуб –
7. Хоць касою касі –
8. Без аглядкі –
9. Што ёсць сілы –

**(Сл. 4 ) Адказ** *(самаправерка)*. **(Сл. 5)**

***2. У кожным радзе слоў знайдзіце прыслоўі.***

А) першы, першынство, упершыню, першынстваваць, першынец;

Б) весялосць, весяліцца, весела, вясёлы, вяселле;

В) сяброўства, сябраваць, сябар, па-сяброўску, сябрына;

Г) маўчанне, моўчкі, маўчаць, маўкліва, маўклівы;

Д) гучны, гучанне, гукаць, гучна, гучнасць;
Е) лёгка, лёгкасць, палёгка.
**(Сл.6) Адказ** *(самаправерка)*
***3 . Што абазначае прыслоўе? Адзначце правільны адказ. (Сл. 7)***
А) прымету прадмета;
Б) прымету прадмета паводле дзеяння;
В) прымету дзеяння або прымету іншай прыметы ці прадмета;
Г) прадмет.
**(Сл. 8) Адказ** *(самаправерка)*
***4. Чым адрозніваюцца прыслоўі ад іншых самастойных часцін мовы? Запішыце правільныя адказы.*** **(Сл. 9)**
А) адказваюць на пытанні які? каторы? чый?
Б) не змяняюцца (не скланяюцца і не спрагаюцца);
В) змяняюцца па асобах і ліках (спрагаюцца);
Г) могуць спалучацца ў словазлучэнні з дзеясловамі і яго асобымі формамі, прыметнікамі і назоўнікамі;
Д) з'яўляюцца ў сказе дапаўненнямі.
**(Сл. 10) Адказ** *(узаемаправерка)*
***5. Пазначце словазлучэнні «прыслоўе + прыметнік».*****(Сл. 11)**
А) жыць па-людску;
Б) незвычайна здзіўлены;
В) па-асабліваму радасны;
Г) дарога дадому;
Д) заўжды неспакойны;
Е) старанна ўпрыгожаны.
**(Сл. 12) Адказ** *(узаемаправерка)*

**4. Вусны пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую.**
**Настаўнік:** Сёння незвычайны дзень. У чым яго асаблівасць? Пра гэта даведаемся з наступнага тэксту. Неабходна прачытаць тэкст, вусна перакласці на беларускую мову. Прыслоўі запісаць, растлумачыць правапіс. **(Сл. 13)**
**ТЭКСТ**
День добрых дел по традиции отмечается **ежегодно** 15 марта.
Международный праздник доброты берёт свое начало в 2007 году в Израиле. В этом мероприятии **впервые** приняли участие 7000 человек. Они решили напомнить людям о том, что каждый может совершать добрые поступки. Это может быть каждодневная небольшая помощь или глобальные социальные проекты. Данная традиция не оставила равнодушным население других стран. С каждым годом в этой акции принимают участие все больше людей из разных уголков мира.

**СЛОЎНІК:**
совершать –здзяйсняць;
поступкі – учынкі;
равнодушный – абыякавы.
***АДКАЗ:***

*Дзень добрых спраў па традыцыі адзначаецца **штогод** 15 сакавіка.*

*Міжнароднае свята дабрыні бярэ свой пачатак у 2007 годзе ў Ізраілі. У гэтым мерапрыемстве **ўпершыню** прынялі ўдзел 7000 чалавек. Яны вырашылі нагадаць людзям пра тое, што кожны можа здзяйсняць добрыя ўчынкі. Гэта можа быць штодзённая невялікая дапамога ці глабальныя сацыяльныя праекты. Традыцыя не пакінула абыякавым насельніцтва іншых краін. З кожным годам у гэтай акцыі прымае ўдзел усё больш людзей з розных куточкаў свету.*

**5. Фізкультхвілінка.**

*Хутка* рукі *ўверх* паднялі.
Пацягнуліся, сонцу ўсміхнуліся.
Промні засвяцілі-
Рукі апусцілі.
Павярнуліся *ўлева*,
Павярнуліся *ўправа*,
*Ціха* селі *зноў* за справу.

**6. Работа з тэкстам. (Сл. 14)**

***Настаўнік:*** Як вы думаеце, што значыць “рабіць добрыя справы”? Давайце звернемся да тэксту. Прачытайце яго самастойна.

| |
|---|
| 1)Гэта было даўно, калі яны пас..ліліся на ўскраіне вялікага горада. 2)Тады Каця была ціхай, хударлявай дзяўчынкай. 3)Яе вялікія, крыху сумныя вочы зусім (па)даросламу глядзелі на свет. |
| 4)За хатай **пачына..ся** луг. 5)Ён адразу паклікаў малую да с..бе, даў ёй мноства цікавых забаў. |
| 6)У той дзень Каця вярталася дамоў і раптам заўважыла над галавой маленькую шэрую птушачку, якая чамус..ці кінулася ёй пад ногі ў высокую траву. 7) *Ці не хворая яна падумала Каця.* |
| 8)Птушка была ***не хворая***. 9)Высока над лугам кружыў вялізны каршун. 10)Каця здагадалася, што драпежнік хацеў схапіць бе..дапаможнае птушанё, і прыкрыла яго сваёй хусткай. |
| 11) З тае пары Каця ведала, што не ўсё ў прыродзе так лагодна і хораша, як здаецца. |

***Настаўнік :*** Што вы можаце сказаць пра гераіню гэтага тэксту? Якімі рысамі характару, на ваш погляд, яна валодае? **(Сл. 15)**

**Выканайце заданні :**

1. Прачытайце ўважліва тэкст.

2. Звярніце ўвагу на першы сказ. Устаўце прапушчаную літару, растлумачце свой выбар. Знайдзіце прыслоўе, якім членам сказа яно з'яўляецца?
3. Прачытайце 2 сказ. Знайдзіце прыслоўе. Якім членам сказа яно з'яўляецца? У якім слове колькасць літар і гукаў не супадае?
4. Растлумачце правапіс падкрэсленага ў 3 сказе слова. Вызначце яго часцінамоўную прыналежнасць. Назавіце слова з суседняй мяккасцю.
5. Растлумачце правапіс выдзеленага слова ў 4 сказе.
6. Зрабіце марфемны разбор прыслоўя, што знаходзіцца ў 5 сказе. Якім спосабам утварылася гэта слова? Якія яшчэ спосабы ўтварэння прыслоўяў вы ведаеце? Якую літару паставілі ў падкрэсленым слове? Чаму?
7. Прачытайце 6 сказ. Назавіце прыслоўі і вызначце іх разрады. Растлумачце правапіс падкрэсленага слова і спосаб яго ўтварэння.
8. Пастаўце знакі прыпынку ў 7 сказе.
9. Зрабіце гукавы запіс падкрэсленага ў 8 сказе слова.
10. Знайдзіце ў 9 сказе прыслоўе і ўтварыце ўсе магчымыя ступені параўнання.
11. У 10 сказе растлумачце правапіс падкрэсленага слова, утварыце ад яго прыслоўе.
12. Зрабіце марфалагічны разбор падкрэсленага ў 11 сказе слова, выкарыстоўваючы схему на форзацы. Знайдзіце прыслоўі, утварыце ўсе магчымыя ступені параўнання.
13. Вызначце стыль і тып тэксту.
14. Дайце тэксту загаловак.
15. **(Сл. 16)** Якія добрыя справы вясною мы можам зрабіць для прыроды? Дайце на гэтае пытанне разгорнуты пісьмовы адказ (5-6 сказаў).

**7. Рэфлексія.** Ці знайшліся пытанні, што выклікалі цяжкасць? Якія тэмы асабіста для сябе вы вызначылі для паўтарэння? Ці ведалі вы раней пра Дзень добрых учынкаў? Давайце ўспомнім прыказкі пра дабро. **(Сл. 17)** Якую з іх вы возьмеце з сабою?

**Быць справядлівым лёгка, а добрым – цяжка.**
**Злу час, дабру – вечнасць.**
**Рабі дабро – вернецца сто разоў.**
**Добры ў кожным доме спатрэбіцца.**
**Для добрага кожны дзень – свята.**
**З добрым сэрцам жыць весела.**
**Жыццё падорана для добрых спраў.**
**Дабро, зробленае употай, два жыцці жыве.**
**Дрэнна тым, хто на дабро не шчодры.**



**8. Дамашняе заданне.** Пр. 228 Пастарайцеся рабіць як мага больш добрых спраў. Добрага ўсім дня. **(Сл. 18)**

**ПРАВЕР СЯБЕ:**

***1. Растлумачце сэнс фразеалагізмаў адным словам (прыслоўем):***

1. Якот наплакаў –
2. Хоць вока выкалі –
3. Адным махам –
4. Край свету –
5. Як па заказе –
6. На адзін зуб –
7. Хоць касою касі –
8. Без аглядкі –
9. Што ёсць сілы –

***2. У кожным радзе слоў знайдзіце прыслоўі.***

а) першы, першынство, упершыню, першынстваваць, першынец;
б) весялосць, весяліцца, весела, вясёлы, вяселле;
в) сяброўства, сябраваць, сябар, па-сяброўску, сябрына;
г) маўчанне, моўчкі, маўчаць, маўкліва, маўклівы;
д) гучны, гучанне, гукаць, гучна, гучнасць;
е) лёгка, лёгкасць, палёгка.

***3 . Што абазначае прыслоўе? Адзначце правільны адказ.***

А) прымету прадмета;
Б) прымету прадмета паводле дзеяння;
В) прымету дзеяння або прымету іншай прыметы ці прадмета;
Г) прадмет.

***4. Чым адрозніваюцца прыслоўі ад іншых самастойных часцін мовы? Запішыце правільныя адказы.***

а) адказваюць на пытанні які? каторы? чый?
б) не змяняюцца (не скланяюцца і не спрагаюцца);
в) змяняюцца па асобах і ліках (спрагаюцца);
г) могуць спалучацца ў словазлучэнні з дзеясловамі і яго асобымі формамі, прыметнікамі і назоўнікамі;
д) з'яўляюцца ў сказе дапаўненнямі.

***5. Пазначце словазлучэнні «прыслоўе + прыметнік».***

а) жыць па-людску;
б) незвычайна здзіўлены;
в) па-асабліваму радасны;
г) дарога дадому;
д) заўжды неспакойны;
е) старанна ўпрыгожаны.

## Тэкст

[1)]Гэта было даўно, калі яны пас..ліліся на ўскраіне вялікага горада. [2)]Тады Каця была ціхай, хударлявай дзяўчынкай. [3)]Яе вялікія, крыху сумныя вочы зусім (па)даросламу глядзелі на свет.

[4)]За хатай **пачына..ся** луг. [5)]Ён адразу паклікаў малую да с..бе, даў ёй мноства цікавых забаў.

[6)]У той дзень Каця вярталася дамоў і раптам заўважыла над галавой маленькую шэрую птушачку, якая чамус..ці кінулася ёй пад ногі ў высокую траву. [7)] *Ці не хворая яна падумала Каця.*

[8)]Птушка была ***не хворая***. [9)]Высока над лугам кружыў вялізны каршун. [10)]Каця здагадалася, што драпежнік хацеў схапіць бе..дапаможнае птушанё, і прыкрыла яго сваёй хусткай.

[11)] З тае пары Каця ведала, што не ўсё ў прыродзе так лагодна і хараша, як здаецца.

### Выканайце заданні да тэксту:

1. Прачытайце ўважліва тэкст.
2. Звярніце ўвагу на 1 сказ. Устаўце прапушчаную літару і растлумачце свой выбар. Знайдзіце прыслоўе, якім членам сказа яно з'яўляецца?
3. Прачытайце 2 сказ. Знайдзіце прыслоўе. Якім членам сказа яно з'яўляецца? У якім слове колькасць літар і гукаў не супадае?
4. Растлумачце правапіс падкрэсленага ў 3 сказе слова. Вызначце яго часцінамоўную прыналежнасць. Назавіце слова з суседняй мяккасцю.
5. Растлумачце правапіс выдзеленага слова ў 4 сказе.
6. Зрабіце марфемны разбор прыслоўя, што знаходзіцца ў 5 сказе. Якім спосабам утварылася гэта слова? Якія яшчэ спосабы ўтварэння прыслоўяў вы ведаеце? Якую літару паставілі ў падкрэсленым слове? Чаму?
7. Прачытайце 6 сказ. Назавіце прыслоўі і вызначце іх разрады. Растлумачце правапіс падкрэсленага слова і спосаб яго ўтварэння.
8. Пастаўце знакі прыпынку ў 7 сказе.
9. Зрабіце гукавы запіс падкрэсленага ў 8 сказе слова.
10. Знайдзіце ў 9 сказе прыслоўе і ўтварыце ўсе магчымыя ступені параўнання.
11. У 10 сказе растлумачце правапіс падкрэсленага слова, утварыце ад яго прыслоўе.
12. Зрабіце марфалагічны разбор падкрэсленага ў 11 сказе слова, выкарыстоўваючы схему на форзацы. Знайдзіце прыслоўі, утварыце ўсе магчымыя ступені параўнання.
13. Вызначце стыль і тып тэксту.
14. Дайце тэксту загаловак.
15. Якія добрыя справы вясною мы можам зрабіць для прыроды? Дайце на гэтае пытанне разгорнуты пісьмовы адказ (5-6 сказаў).

День добрых дел по традиции отмечается **ежегодно** 15 марта.

Международный праздник доброты берёт свое начало в 2007 году в Израиле. В этом мероприятии **впервые** приняли участие 7000 человек. Они решили напомнить людям о том, что каждый может совершать добрые поступки. Это может быть каждодневная небольшая помощь или глобальные социальные проекты. Данная традиция не оставила равнодушным население других стран. С каждым годом в этой акции принимают участие все больше людей из разных уголков мира.

**СЛОЎНІК:**

совершать –здзяйсняць;
поступкі – учынкі;
равнодушный – абыякавы.

**План-канспект урока беларускай мовы ў 8 класе**
**Тэма:** «Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку»
**Мэта:**

- спрыяць асэнсаванню вучнямі паняцця адасоблены прыдатак, прычын, умоў і сродкаў адасаблення прыдаткаў.
- выпрацоўваць уменні вызначаць адасобленыя прыдаткі, адрозніваць развітыя і неразвітыя прыдаткі;
- правільна інтанаваць сказы з адасобленымі прыдаткамі, фармуляваць адпаведныя пунктуацыйныя правілы;
- выпрацоўваць уменні ўжываць адасобленыя прыдаткі ва ўласным маўленні.

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант** *(на перапынку гучыць паланез Міхала Клеафаса Агінскага "Развітанне з Радзімаю", яго сучасная апрацоўка)*
**Слова настаўніка:** Ці спадабалася музыка, што гучала на перапынку? Хто ведае, што за музыка? *(Сл. 3 растлумачыць значэнне слова "паланэз")* Які настрой выклікала?

**II. Праверка дамашняга задання :**

1. Пр. 335 (на сл. № 5 тлумачэнне кожнага сказа на выпадак, калі будуць пытанні ці няправільныя адказы).

## ПРАВЯРАЕМ ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ!

4. ***Рака***, ***спакойная ўчора***, уночы выйшла з берагоў. - **Спакойная ўчора рака** ўночы выйшла з берагоў.

5. Здалёку віднелася ***школа*** , ***зусім новая, пафарбаваная, нядаўна ўведзеная ў строй***. - Здалёку віднелася **зусім новая, пафарбаваная, нядаўна ўведзеная ў строй школа.**

6. ***Трава*** , ***рослая, густая***, валілася на бок тугім валам. - **Рослая, густая трава** валілася на бок тугім валам.

7. ***Цёмны і ціхі вечар*** апусціўся на зямлю. - **Вечар , цёмны і ціхі,** апусціўся на зямлю.

8. У ***ціхай, зарослай асакой і чаротам затоцы*** стаяў човен. - **У затоцы, ціхай, зарослай асакой і чаротам,** стаяў човен.

**Настаўнік :** Увага на экран. Прачытайце прыказку. Растлумачце яе сэнс.




**Галава прыгожая не тым, што на ёй, а тым, што ў ёй.**

Як думаеце, чаму я вас скіравала да гэтага выказвання?

2. Праверачная работа:

**К 1.**

***А. Знайдзіце сказы, у якіх азначэнні адасабляюцца. Запішыце нумары гэтых сказаў.***

1. Жнівенскае сонца яшчэ даволі гарачае асвятляла абмялелую за лета раку.
2. Адталая за дзень зямля ўночы пасівела ад халоднага інею.
3. Вечарам запыленныя і стомленыя мы дабрылі да хутара.
4. Вясною і восенью тут сівы туман вісіць густы і ліпкі.
5. За курганам бліснула налітая веснавой вадой лагчынка.
6. Велічны і бязмежны спакой млеў пад чыстым і высокім сонцам.
7. Няветліва пазіралі пачарнелыя стрэхі хат і вокны выбеленыя зімняю сцюжаю.
8. Што дзень глядзеў я безнадзейны на ўсход і захад залаты.
9. Ахутаны туманам горад здаваўся брудным, няўтульным.
10. Камандзір атдаў загад наступаць.

***Б. Знайдзіце словы з арфаграфічнаю памылкаю, запішыце іх правільна.***

*Адказы:*

Ліст адказаў вучня (прозвішча, імя)________________________________

А. 1,3,4,7,8,9

Б. Жніве**нь**скае, запыленыя, восенню, штодзень, аддаў.

**К 2.**

***А. Знайдзіце сказы, у якіх азначэнні адасабляюцца. Запішыце нумары гэтых сказаў.***

1. Усю ноч дзьмуў вецер сухі, марозлівы.
2. Апсаджаная высокімі ліпамі алея вяла да самай вёскі.

3. Сады абсыпаныя свежымі пялёсткамі гамонку з ветрам ціхую вядуць.
4. Мікола заўсёды сумны і маўклівы з вяртаннем Аленкі не проста павесялеў, а і расгаварыўся.
5. На раз’езджаную машынамі дарогу насоўваўся вечар
6. Упрыгожанны да навагодніх святаў горад блішчаў мноствам агнёў, шумеў безліччу галасоў, ззяў тысячамі ўсмешак.
7. Напалоханыя вялікім зьверам хлопцы беглі як жару ўхапіўшы.
8. З галінак зачэпленых галавою пасыпаўсь іскрысты снег.
9. Аблітыя срэбрам інею зіхацяць на сонцы сады.
10. Пасля кароткага прывалу камандзір падаў каманду строіцца.

***Б. Знайдзіце словы з арфаграфічнаю памылкаю, запішыце іх правільна.***

*Адказы:*

Ліст адказаў вучня (прозвішча, імя)________________________________
А. 1,3,4,7,8,9
Б. Абсаджаная, разгаварыўся, упрыгожаны, зверам, пасыпаўся.

**Настаўнік.***(Сабраць лісты з адказамі)* Звярніце ўвагу на экран. Як вы разумееце сэнс прыказкі?




**Настаўнік.** Паглядзіце на правільныя адказы да праверачнай работы.



Спадзяюся, вы атрымалі асалоду ад плоду свайго вучэння. Адзнакі за вашу работу вы атрымаеце на наступным уроку.

**III. Тлумачэнне новай тэмы.**

Настаўнік : Каб і далей атрымліваць асалоду, працягнем нялёгкую працу. Звярніце ўвагу на тэму, што мы павінны сёння на ўроку зрабіць, чаму навучыцца? Вызначце мэту нашага ўрока.

***Аднаўленне вывучанага:***

- Што такое адасабленне? *(Адасабленне — гэта сэнсавае і інтанацыйнае выдзяленне дададзеных членаў сказа, якія змяшчаюць дадатковыя паведамленні)*

-Што такое прыдатак? *(& 22 . Прыдатак — гэта азначэнне, выражанае назоўнікам і дапасаванае да паяснёнага слова звычайна ў склоне)*

**Пр. 340.** (Вусна.) Успомніце, што называецца прыдаткам. Назавіце ў сказах адзіночныя прыдаткі разам з паяснёнымі словамі, звярніце ўвагу на афармленне іх на пісьме.

1. На сінім небе**-акіяне** павіслі хмаркі-**астраўкі**.
2. Рупны Мінск -**гаспадар** працай славіцца плённай
3. Лятуць журавы на гару **Арарат**.
4. Нішчымны колас-**сіраціна** ў зацішку лёгенька гайдаўся.

- Чытаць правіла на ст. 203-204 .

**Настаўнік.** *Калі прыдатак – гэта азначэнне, то якія пункты правіла пастаноўкі знакаў прыпынку пры адасабленні тут супадаюць з папярэдняй тэмаю, а якія новыя?*

**Пр. 341** (вусна) *Назавіце прыдаткі і прычыны іх адасаблення.*

2. Ад дрэва да дрэва ідзе пехатой кастрычнік, **мастак адмысловы**, і фарбай бурштынавай і залатой распісвае кроны дубровы.
4. Ці ж яму, **гарэзе,** усядзець на месцы?
5. На возеры ў лодцы сядзеў каваль, **па мянушцы Мамай** .

- Ст. 204-205 . Чытаем правіла.

**Пр. 342 (пісьмова)**

4. Усё сваё жыццё жаўна, **ці чорны дзяцел**, праводзіць на ствалах дрэў і ў дупле.
5. Міхал з Антосем, як старыя, займалі месцы канцавыя. *(З ЯКОГА ТВОРА СКАЗ?) (Я. Колас "Новая зямля")*
6. Як правінцыяла, ён пракаціў мяне са сталічным фасонам і на **фаэтоне*** — ад вакзала да гасцініцы «Бельгія» .

*Увага на экран (работа са словам)*

## ФАЭТОН - лёгкі экіпаж з адкідным верхам



**Хвілінка адпачынку.** *(Урывак фільма-прэзентацыі сядзібы Агінскага ў Залессі Гродзенскай вобласці "Тут гучаць паланэзы" .з 4.47 па 6.04)*

**IV. Замацаванне**

**Пр. 346. Чытаем тэкст**

[1]Суботнім майскім ранкам мы, вучні пачатковых класаў, адправіліся ў чарговае ***путешествіе*** па родным краі. [2] Сёння нас чакала экскурсійная паездка ў агра-гарадок Залессе з мэтай наведвання музея-сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага, таленавітага кампазітара і дзяржаўнага дзеяча пачатку XIX стагоддзя, аўтара вядомага паланэзу «Развітанне з Радзімай». [3] Наша знаёмства з «Паўночнымі Афінамі», культурным цэнтрам, дзе пастаянна праводзілі**ся** мастацкія выстаўкі, балі, літаратурныя чытанні і музычныя вечары, пачало**ся** са старадаўняй ліпавай алеі, якая раней служыла пад'язной дарогай. [4] Сустрэлі нас дрэвы, якія пражылі свой век з глыбокай годнасцю.

[5] У канцы аллеі мы заўважылі памятны камень роду Агінскіх, а таксама каплічку, якая ў тыя часы была сямейнай. [6] Непаўторныя пейзажы прымусілі нас прагуляцца па парку. [7] Асабліва мы залюбаваліся возерам з векавымі вербамі, астраўкамі і мосцікамі. [8] І вось у назначаны час адпраўляемся ў прыгожы сядзібны дом з калонамі. [9] На парозе нас гасцінна сустракае экскурсавод, **апранутая** як старэйшая дачка Агінскага Амелія.[10] Яна ў цікавай і даступнай форме на роднай мове знаёміць нас з жыццём і дзейнасцю кампазітара і яго сям'і. [11] Потым **яе** па чарзе змяняюць Іда, малодшая сястра, Ірэніуш, брат, і нават асабісты сакратар Агінскага. [12] Дзякуючы арыгінальна пабудаванай экскурсіі мы адчулі

атмасферу таго часу, як быццам перанесліся ў XIX стагоддзе. [13] Экспазіцыя музея-сядзібы, якая прадстаўлена 13 заламі, вельмі ўразіла нас. [14] Зала для музіцыравання з музычнымі інструментамі і пюпітрам, вялікая і малая гасцёўні з камінамі і мноствам партрэтаў, кабінет, більярдная, кафейня, аранжарэя з вялікай колькасцю экзатычных раслін, велізарны ўнутраны двор, альтанка Амеліі. [15] Пасля наведвання сядзібы мы адправіліся да невялікай рачулкі, дзе адшукалі памятныя камяні, пакінутыя тут з тых далёкіх часоў. [16] Адзін з іх прысвечаны Тадэвушу Касцюшку, другі — Жану Ралею, настаўніку Агінскага. [17] Напрыканцы кожны з нас загадаў жаданне ля самага старога дрэва ў парку. [18] Такім чынам, экскурсія ў «Паўночныя Афіны» аказалася змястоўнай і атмасфернай. [19] А прыгожыя фотаздымкі будуць нам успамінам аб гэтым цудоўным месцы. (*М. ЖУК*)

**Настаўнік:**
1. Вызначце стыль тэксту.
2. Вызначце тып маўлення.
3. Якая тэма і асноўная думка тэксту?
4. Каму адрасаваны тэкст?

***Работа са словам: (Сл. 14, 15, 16)***

**КАПЛІЧКА - невялікі царкоўны або касцельны будынак з іконамі без алтара; малельня.**



**Пюпітр - зручная падстаўка для нот**





**Альтанка** — драўляная ці мураваная дэкаратыўная пабудова для адпачынку, абароны ад сонца і ападкаў, часцей за ўсё выконваецца ў выглядзе ратонд. (Бяседка)




5. Назавіце № нумары сказаў, дзе ёсць адасобленыя прыдаткі. Растлумачце знакі прыпынку.

**Выканайце заданні**:
1. Запішыце нумары сказаў, дзе ёсць адасобленыя азначэнні.
2. Звярніце ўвагу на выдзеленае слова ў 1 сказе. Запішыце яго па-беларуску ў той граматычнай форме, у якой яно знаходзіцца ў тэксце.
3. Знайдзіце арфаграфічную памылку ў 2 сказе. Запішыце слова правільна.
4. Лічэбнік з 2 сказа запішыце літарамі.
5. Якая марфема выдзелена ў падкрэсленых у 3 сказе дзеясловах? Як называюцца такія дзеясловы?
6. Знайдзіце арфаграфічную памылку ў 5 сказе. Запішыце слова правільна.
7. У 7 сказе знайдзіце дзейнік. Якой часцінай мовы ён выражаны? Адказ запішыце.
8. Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае ў 9 сказе слова?
9. Палічыце, колькі гукаў мае выдзеленае ў 11 сказе слова? Адказ запішыце літарамі.
10. Уявіце, што вы аказаліся на адным з баляў у сядзібе Агінскага. Напішыце пра гэтае здарэнне невялікае сачыненне.

Адказы вучняў:
1. 9,15
2. Падарожжа
3. Аграгарадок
4. Дзевятнаццатага
5. Постфікс, зваротныя
6. Алеі
7. Мы –займеннік
8. Дзеепрыметнік

| 9. Чатыры |
| --- |

**V. Абагульненне вывучанага.**

1. Пры якіх умовах адасабляюцца прыдаткі?
2. Якія асаблівасці інтанацыі пры чытанні такіх сказаў?
3. Што бачым на слайдзе (работа са словам)?








4. Прадоўжыце прыказкі.

**Корань вучэння горкі...**

**Галава прыгожая не тым, што…**

**<u>VI. Дамашняе заданне.</u>** (на выбар) 1. Са словамі “ каплічка”, “альтанка”, “паланэз”, “пюпітр”, “фаэтон” скласці сказы з прыдаткамі. 2. Выканаць заданне да тэксту № 10.

**<u>VII.</u>** Рэфлексія *(гучыць музыка, паланез Міхала Клеафаса Агінскага “Развітанне з Радзімаю”, яго сучасная апрацоўка)*

**Настаўнік** . Калі ўсё на ўроку вам было зразумела, пакіньце на дошцы зялёны знак, калі яшчэ ёсць пытанні, то жоўты, калі тэму не зразумелі - чырвоны.

Праверачная работа:

<u>**К 1.**</u>

***А. Знайдзіце сказы, у якіх азначэнні адасабляюцца. Запішыце нумары гэтых сказаў.***

1. Жнівенскае сонца яшчэ даволі гарачае асвятляла абмялелую за лета раку.
2. Адталая за дзень зямля ўночы пасівела ад халоднага інею.
3. Вечарам запыленныя і стомленыя мы дабрылі да хутара.
4. Вясною і восенью тут сівы туман вісіць густы і ліпкі.
5. За курганам бліснула налітая веснавой вадой лагчынка.
6. Велічны і бязмежны спакой млеў пад чыстым і высокім сонцам.
7. Няветліва пазіралі пачарнелыя стрэхі хат і вокны выбеленыя зімняю сцюжаю.
8. Што дзень глядзеў я безнадзейны на ўсход і захад залаты.
9. Ахутаны туманам горад здаваўся брудным, няўтульным.
10. Камандзір атдаў загад наступаць.

***Б. Знайдзіце словы з арфаграфічнаю памылкаю, запішыце іх правільна.***

Ліст адказаў вучня (прозвішча, імя)________________________________

А.________________________________________________________________

Б. _______________________________________________________________

<u>**К 2.**</u>

***А. Знайдзіце сказы, у якіх азначэнні адасабляюцца. Запішыце нумары гэтых сказаў.***

1. Усю ноч дзьмуў вецер сухі, марозлівы.
2. Апсаджаная высокімі ліпамі алея вяла да самай вёскі.
3. Сады абсыпаныя свежымі пялёсткамі гамонку з ветрам ціхую вядуць.
4. Мікола заўсёды сумны і маўклівы з вяртаннем Аленкі не проста павесялеў, а і расгаварыўся.
5. На раз’езджаную машынамі дарогу насоўваўся вечар
6. Упрыгожанны да навагодніх святаў горад блішчаў мноствам агнёў, шумеў безліччу галасоў, ззяў тысячамі ўсмешак.
7. Напалоханыя вялікім зьверам хлопцы беглі як жару ўхапіўшы.
8. З галінак зачэпленых галавою пасыпаўсь іскрысты снег.
9. Аблітыя срэбрам інею зіхацяць на сонцы сады.

10. Пасля кароткага прывалу камандзір падаў каманду строіцца.
*Б. Знайдзіце словы з арфаграфічнаю памылкаю, запішыце іх правільна.*

**Уважліва прачытайце тэкст**

[1]Суботнім майскім ранкам мы, вучні пачатковых класаў, адправіліся ў чарговае ***путешествіе*** па родным краі. [2] Сёння нас чакала экскурсійная паездка ў агра-гарадок Залессе з мэтай наведвання музея-сядзібы Міхала Клеафаса Агінскага, таленавітага кампазітара і дзяржаўнага дзеяча пачатку XIX стагоддзя, аўтара вядомага паланэзу «Развітанне з Радзімай». [3] Наша знаёмства з «Паўночнымі Афінамі», культурным цэнтрам, дзе пастаянна праводзілі**ся** мастацкія выстаўкі, балі, літаратурныя чытанні і музычныя вечары, пачало**ся** са старадаўняй ліпавай алеі, якая раней служыла пад’язной дарогай. [4] Сустрэлі нас дрэвы, якія пражылі свой век з глыбокай годнасцю.
[5] У канцы аллеі мы заўважылі памятны камень роду Агінскіх, а таксама каплічку, якая ў тыя часы была сямейнай. [6] Непаўторныя пейзажы прымусілі нас прагуляцца па парку. [7] Асабліва мы залюбаваліся возерам з векавымі вербамі, астраўкамі і мосцікамі. [8] І вось у назначаны час адпраўляемся ў прыгожы сядзібны дом з калонамі. [9] На парозе нас гасцінна сустракае экскурсавод, **апранутая** як старэйшая дачка Агінскага Амелія.[10] Яна ў цікавай і даступнай форме на роднай мове знаёміць нас з жыццём і дзейнасцю кампазітара і яго сям’і. [11] Потым **яе** па чарзе змяняюць Іда, малодшая сястра, Ірэніуш, брат, і нават асабісты сакратар Агінскага. [12] Дзякуючы арыгінальна пабудаванай экскурсіі мы адчулі атмасферу таго часу, як быццам перанесліся ў XIX стагоддзе. [13] Экспазіцыя музея-сядзібы, якая прадстаўлена 13 заламі, вельмі ўразіла нас. [14] Зала для музіцыравання з музычнымі інструментамі і пюпітрам, вялікая і малая гасцёўні з камінамі і мноствам партрэтаў, кабінет, більярдная, кафейня, аранжарэя з вялікай колькасцю экзатычных раслін, велізарны ўнутраны двор, альтанка Амеліі. [15] Пасля наведвання сядзібы мы адправіліся да невялікай рачулкі, дзе адшукалі памятныя камяні, пакінутыя тут з тых далёкіх часоў. [16] Адзін з іх прысвечаны Тадэвушу Касцюшку, другі — Жану Ралею, настаўніку Агінскага. [17] Напрыканцы кожны з нас загадаў жаданне ля самага старога дрэва ў парку. [18] Такім чынам, экскурсія ў «Паўночныя Афіны» аказалася змястоўнай і атмасфернай. [19] А прыгожыя фотаздымкі будуць нам успамінам аб гэтым цудоўным месцы. (*М. ЖУК*)

**Выканайце заданні да тэксту**:

1. Запішыце нумары сказаў, дзе ёсць адасобленыя азначэнні.
2. Звярніце ўвагу на выдзеленае слова ў 1 сказе. Запішыце яго па-беларуску ў той граматычнай форме, у якой яно знаходзіцца ў тэксце.
3. Знайдзіце арфаграфічную памылку ў 2 сказе. Запішыце слова правільна.
4. Лічэбнік з 2 сказа запішыце літарамі.
5. Якая марфема выдзелена ў падкрэсленых у 3 сказе дзеясловах? Як называюцца такія дзеясловы?
6. Знайдзіце арфаграфічную памылку ў 5 сказе. Запішыце слова правільна.
7. У 7 сказе знайдзіце дзейнік. Якой часцінай мовы ён выражаны? Адказ запішыце.
8. Якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае ў 9 сказе слова?
9. Палічыце, колькі гукаў мае выдзеленае ў 11 сказе слова? Адказ запішыце літарамі.
10. Уявіце, што вы аказаліся на адным з баляў у сядзібе Агінскага. Напішыце пра гэтае здарэнне невялікае сачыненне.

**План-канспект урока беларускай мовы ў 9 класе**
**Тэма:** «Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак»
**Мэта:** замацоўваць атрыманыя веды пра складаныя сказы, вучыць вызначаць сэнсавыя адносіны паміж часткамі ў сказах камбінаванай будовы, сродкі сінтаксічнай сувязі, будаваць схемы, перабудоўваць простыя сказы ў складаныя;
развіваць вусную і пісьмовую культуру мовы, садзейнічаць развіццю маўлення, зносін, выхоўваць працавітасць, настойлівасць у дасягненні мэты;
выхоўваць патрыятычныя пачуцці, садзейнічаць развіццю гуманізму, дабрыні.
**Ход урока.**
**I. Праверка дамашняга задання.** *(Неабходна было прачытаць тэкст "Зубрыная сцежка", падрыхтаваць яго пераказ, выпісаць па адным складаназлучаным, складаназалежным, бяззлучнікавым сказе.)*
1. Лісты з заданнямі па тэксце "Зубрыная сцежка" *(выконваюць заданне 6 чалавек)*.

**Прачытаць, уставіць прапушчаныя знакі прыпынку і літары.**

Партызаны знясіленыя ця..кім боем вярталіся (з,с) задання. Яны ціха пр..біраліся па бало..е намацваючы нагамі больш цвёрды.. мяс..іны. Камандзір ведаў што сярод бя..крайніх балот ёсць (не)вялікія сухія выспы якія могуць стаць мес..ам прытулку. Нарэшце яны выбраліся на цвёрдую з..млю і ра..мясціліся ў ельніку. Ра..клалі агонь сагрэліс.. .

І раптам падбе.. дн..вальны і гукнуў на ўсю моц Хлопцы уставайце зубр у ельніку! Партызаны кінуліся туды куды паказаў дн..вальны. У гушчары стаяў в..лізны зубр. Адзін (з,с) партызан узяў зубра на прыцэл. Засталос.. толькі на..існуць на спускавы курок. Але ў той жа момант с..сед ударыў таварыш..а пад руку. Аўтаматная чарга р..занула па дрэвах. Зубр раптам пру..ка падскочыў прыгнуў ш..ю і панёсся па лес.. Партызаны разышліся абмяркоўваючы па(д, дз)ею...

2. Пераказаць тэкст *(выклікаецца 1 вучань, астатнія слухаюць тэкст, працуюць карэктарамі)*.
3. Прачытаць складаназлучаныя сказы, складаназалежныя, бяззлучнікавыя, якія выпісалі дома.
**II. Тлумачэнне новай тэмы.**
- &30, старонка 140-141. Чытаць правіла *(услых)*.

- Практыкаванне 199. Прачытайце тэкст з энцыклапедыі «Беларуская мова». *(Які стыль гэтага тэксту? На якія групы падзяляюцца складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак? З дапамогай якіх сродкаў аб'ядноўваюцца сэнсавыя часткі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак?)*

**III. Замацаванне новай тэмы.**

**Практыкаванне 200.** Прачытайце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. Вызначце ў гэтых сказах сродкі іх сувязі. *(Схемы 1, 2, 3 сказа вучні запісваюць на дошцы, звяраюцца з правільным адказам на слайдзе.)*

1. Ён зірнуў на бацьку глыбокімі вачыма, яны былі цёмныя, амаль чорныя, і гэта сведчыла аб тым, што ён хвалюецца (Б. Мікуліч).

$^1$[- = ] , $^2$[- = ] , і $^3$[- = ] , $^4$(што - = ).

**Практыкаванне 200**

**1. Ён зірнуў на бацьку глыбокімі вачыма, яны былі цёмныя, амаль чорныя, і гэта сведчыла аб тым, *што* ён хвалюецца.**

**$^1$[- = ] , $^2$[- = ] , і $^3$[- = ] , $^4$(*што* - = ).**

*Слайд 4.*

2. Хмара на гарадок найшла неспадзявана: свяціла нізкае сонца, і раптам у вокнах пацямнела (І. Чыгрынаў).

$^1$[- = ] : $^2$[= - ] , і $^3$[ = ].

**2. Хмара на гарадок найшла неспадзявана: свяціла нізкае сонца, і раптам у вокнах пацямнела.**

$^1$[- = ] : $^2$[= - ] , і $^3$[ = ].

*Слайд 5.*

3. Любі´ць прызначана мне лёсам, я не памру, пакуль люблю (А. Пісьмянкоў). [ ] , [ ] , (пакуль ).

**3. Любіць прызначана мне лёсам, я не памру, *пакуль* люблю.**

*Слайд 6.* **[= ] , [ - =] , (*пакуль* =).**

6. Вішні ды слівы ўжо адцвіталі, але яблыні абсыпаліся самай квеценню, ад якой ноч, здавалася, спачывала ў святле пражытага дня (В. Карамазаў). [ ] , але [ ] , (ад якой ). *(Схему сказа вучні робяць самастойна, узаемаправерка)*

**6. Вішні ды слівы ўжо адцвіталі, але яблыні абсыпаліся самай квеценню, ад *якой* ноч, здавалася, спачывала ў святле пражытага дня.**

*Слайд 7.* **[- = ] , але [- = ] , ( *якой* - =).**

**Практыкаванне 201.** *Прачытайце сказы. Суаднясіце сказы з прапанаванымі схемамі.*

1. Хлопец гаварыў і голас яго зрываўся на дзіцячы крык у якім чуліся крыўда боль растаптаных мар спадзяванняў (М. Лынькоў). 2. І пытаўся я ў сябе няўжо тады стагоддзі назад мае малапісьменныя продкі ведалі і разумелі што без Радзімы жыццё іх страціць сэнс і яны тут жа знікнуць бясследна растворацца ў свеце белым? (В. Гігевіч). 3. На дварэ ідзе сумны дождж і дарогі раскіслі рухацца па іх цяжка (К. Чорны). 4. Утульнасці тут было небагата дзьмула з вокнаў дым не хацеў ісці ў комін і расплываючыся пад нізкай столлю выядаў вочы але ўсё гэта здалося ім раем пасля той непагадзі ад якой яны схаваліся сюды (В. Быкаў).

а) [ ]: [ ], [ ] , але [ ], (ад якой...) .
б) [ ] , і [ ], (у якім...) .
в) [ ] : [ ], (што...) і ( ) ?
г) [ ] , і [ ], [ ] .

*Слайд 8.* **Адказ: 1Б, 2В, 3Г, 4А**

**IV. Фізкультхвілінка.** *(Трэнажор для вачэй. Кожнае практыкаванне зрабіць 2 разы.)*

**V. Работа з тэкстам.** (Настаўнік чытае тэкст.)

## ВЫРАТАВАНАЯ БУСЛЯНКА

[1]Калі бой за сялом сціх і фашысты ўцяклі, вясковыя людзі ўбачылі: гарыць старая высокая ліпа. [2]На в..ршыні дрэва прыл..пілася буслянка, бусляняты бе..дапаможна высоўваліся з гнязда, махалі крыламі, а над імі кружылі, то кідаючыся (у/ў)ніз да гнязда, то ўзвіваючыся (у/ў)высь ад полымя, ашалелыя ад ***роспачы*** бацькі-буслы. [3]Палалі (на)вокал вясковыя хаты. [4]Яшчэ можна было выхапіць з агню хоць які вясковы скарб, што застаўся пакуль цэлым, аднак людзі пра бяду сваю забыліся, а бачылі толькі гэту ў бурным полымі ліпу.

[5]Усе да аднаго без ніякай каманды ці загаду кінуліся ратаваць безабаронных птушыных дзяцей. [6]Хто як мог, у чым толькі маглі, неслі ваду. [7]Хутка пажарная трывога была скончана. [8]Ліпа хоць і стала чорная, абвугленая, але бусляняты засталіся цэлыя. [9]І буслы, не зважаючы на тое, што побач трашчыць і шугае полымя , бо яшчэ гарэлі хаты, кінуліся ў сваё гняздо да дзяцей. [10]Яны распасцíралі свае шырокія крылы і абмахвалі імі буслянят, асцярожна дзюбамі прабавалі, ці здаровенькія яны. [11]Мусіць, упэўніўшыся ў тым, што з іх дзеткамі ўсё добра, сталі ўзносіць хвалу людзям. [12]Высока ўскінуўшы галовы, заліваліся клёкатам, то меладычна-журботным, то ўрачыста-шчымлівым. [13]Нібы спявалі працяглую песню добрым людзям за абарону і ласку.

[14]Людзі збіліся ў адзін гурт і, задаволеныя сабой, з радасцю глядзелі на буслоў. [15]Гэта быў адзін з тых шчаслівых момантаў, калі пачуццё любасці да жыцця ўзвышае душы людзей, робіць іх больш адкрытымі, чыстымі і асветленымі, калі адчуваецца благаславенне на новую мужнасць у імя ўсяго жывога на зямлі.

**Работа са словам.**

*Слайд 11.*

**Роспач.** Стан, пачуццё крайняй безнадзейнасці, упадку духу, выкліканы якім-небудзь няшчасцем, непрыемнасцю.

**Роспач -** ***(рус.)*****отчаяние.**

**Роспач, адчай.**

**Ніколі не кідайся ў роспач, а цярпліва і настойліва дамагайся свайго!**



**Заданні да тэксту**

1. Уважліва прачытайце тэкст.
2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.
3. Які стыль гэтага тэксту? Вызначце тып маўлення.
4. Прачытайце 1 абзац.
5. Устаўце прапушчаныя літары, запішыце словы, растлумачце іх напісанне.
6. Знайдзіце сказы з рознымі відамі сувязі. Назавіце іх нумары, пабудуйце схемы, вызначце від сувязі паміж часткамі.

( [1]Калі бой за сялом сціх і фашысты ўцяклі, вясковыя людзі ўбачылі: гарыць старая высокая ліпа. (калі - =) і (калі - = ), [ - = ] : [ = - ]. Паміж 1, 2, 3 часткамі сузалежнае аднароднае падпарадкаванне, паміж сэнсавымі часткамі бяззлучнікавая сувязь.

**[1]Калі бой за сялом сціх і фашысты ўцяклі, вясковыя людзі ўбачылі: гарыць старая высокая ліпа.**

*Слайд 13.* 1(*калі* - =) і 2( - = ), 3[ - = ] : 4[ = - ].

7. Назавіце ў гэтым сказе слова з суседняй мяккасцю, яго часціну мовы *(Сціх, дзеяслоў.)*
8. Чаму паміж словамі старая і высокая не стаіць коска?

[2]На вяршыні дрэва прыляпілася буслянка, буслянята бездапаможна высоўваліся з гнязда, махалі крыламі, а над імі кружылі, то кідаючыся ўніз да гнязда, то ўзвіваючыся ўвысь ад полымя, ашалелыя ад роспачы бацькі-буслы.
[ = - ], [ - =, = ], а [ = - ].

**[2]На вяршыні дрэва прыляпілася буслянка, буслянята бездапаможна высоўваліся з гнязда, махалі крыламі, а над імі кружылі, то кідаючыся ўніз да гнязда, то ўзвіваючыся ўвысь ад полымя, ашалелыя ад роспачы бацькі-буслы.**

*Слайд 14.* **1[ = - ], 2[ - =, = ], а 3[ = - ].**

9. Назавіце зваротныя дзеясловы і формы дзеяслова (*Прыляпілася, высоўваліся, кідаючыся, узвіваючыся)*
10. Знайдзіце ў сказе дзеепрыметнік. (*Ашалелыя*)
11. Чаму “буслы-бацькі” пішуцца праз дэфіс? (*Буслы – прыдатак*)

[4]Яшчэ можна было выхапіць з агню хоць які вясковы скарб, што застаўся пакуль цэлым, аднак людзі пра бяду сваю забыліся, а бачылі толькі гэту ў бурным полымі ліпу.
[1][ = ], [2](што =), аднак [3][- =, а = ].

**[4]Яшчэ можна было выхапіць з агню хоць які вясковы скарб, *што* застаўся пакуль цэлым, аднак людзі пра бяду сваю забыліся, а бачылі толькі гэту ў бурным полымі ліпу.**

**[1][ = ], [2](што =), аднак [3][- =, а = ].**

*Слайд 15.*

12. Назавіце ў гэтым сказе словы, у якіх не супадае колькасць літар і колькасць гукаў. *(Яшчэ, выхапіць, хоць, які, пакуль, людзі, сваю,толькі)*
13. Прачытайце тэкст яшчэ раз. Якія словы вы ўзялі б сабе на заметку? Запішыце 15 самых цяжкіх, на ваш погляд, слоў.

**VI. Падагульненне вывучанага.**

- Што такое складаныя сказы з рознымі відамі сувязі сказаў?
- Якія іх віды ёсць?

**VII. Рэфлексія.**

**VIII. Дамашняе заданне.** &30, пр. 204

**Прачытаць, уставіць прапушчаныя знакі прыпынку і літары.**

Партызаны знясіленыя ця..кім боем вярталіся (з,с) задання. Яны ціха пр..біраліся па бало..е намацваючы нагамі больш цвёрды.. мяс..іны. Камандзір ведаў што сярод бя..крайніх балот ёсць (не)вялікія сухія выспы якія могуць стаць мес..ам прытулку. Нарэшце яны выбраліся на цвёрдую з..млю і ра..мясціліся ў ельніку. Ра..клалі агонь сагрэліс.. .

І раптам падбе.. дн..вальны і гукнуў на ўсю моц Хлопцы уставайце зубр у ельніку! Партызаны кінуліся туды куды паказаў дн..вальны. У гушчары стаяў в..лізны зубр. Адзін (з,с) партызан узяў зубра на прыцэл. Засталос.. толькі на..існуць на спускавы курок. Але ў той жа момант с..сед ударыў таварыш..а пад руку. Аўтаматная чарга р..занула па дрэвах. Зубр раптам пру..ка падскочыў прыгнуў ш..ю і панёсся па лес.. . Партызаны разышліся абмяркоўваючы па(д, дз)ею.

## ВЫРАТАВАНАЯ БУСЛЯНКА

[1]Калі бой за сялом сціх і фашысты ўцяклі, вясковыя людзі ўбачылі: гарыць старая высокая ліпа. [2]На в..ршыні дрэва прыл..пілася буслянка, бусляняты бе..дапаможна высоўваліся з гнязда, махалі крыламі, а над імі кружылі, то кідаючыся (у/ў)ніз да гнязда, то ўзвіваючыся (у/ў)высь ад полымя, ашалелыя ад ***роспачы*** бацькі-буслы. [3]Палалі (на)вокал вясковыя хаты. [4]Яшчэ можна было выхапіць з агню хоць які вясковы скарб, што застаўся пакуль цэлым, аднак людзі пра бяду сваю забыліся, а бачылі толькі гэту ў бурным полымі ліпу.

[5]Усе да аднаго без ніякай каманды ці загаду кінуліся ратаваць безабаронных птушыных дзяцей. [6]Хто як мог, у чым толькі маглі, неслі ваду. [7]Хутка пажарная трывога была скончана. [8]Ліпа хоць і стала чорная, абвугленая, але бусляняты засталіся цэлыя. [9]І буслы, не зважаючы на тое, што побач трашчыць і шугае полымя , бо яшчэ гарэлі хаты, кінуліся ў сваё гняздо да дзяцей. [10]Яны распасціралі свае шырокія крылы і абмахвалі імі буслянят, асцярожна дзюбамі прабавалі, ці здаровенькія яны. [11]Мусіць, упэўніўшыся ў тым, што з іх дзеткамі ўсё добра, сталі ўзносіць хвалу людзям. [12]Высока ўскінуўшы галовы, заліваліся клёкатам, то меладычна-журботным, то ўрачыста-шчымлівым. [13]Нібы спявалі працяглую песню добрым людзям за абарону і ласку.

[14]Людзі збіліся ў адзін гурт і, задаволеныя сабой, з радасцю глядзелі на буслоў. [15]Гэта быў адзін з тых шчаслівых момантаў, калі пачуццё любасці да жыцця ўзвышае душы людзей, робіць іх больш адкрытымі, чыстымі і асветленымі, калі адчуваецца благаславенне на новую мужнасць у імя ўсяго жывога на зямлі.

**План-канспект урока беларускай мовы ў 11 класе**

**Тэма:** «Правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку»
**Мэта:**
1) узнавіць і пашырыць веды пра складаназалежныя сказы, правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах, удасканальваць уменне афармляць складаназалежныя сказы ў адаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі; знаходзіць і выпраўляць сінтаксічныя і пунктуацыйныя памылкі;
2) развіваць уменне працаваць з тэарытычным матэрыялам, карыстацца асабістым вопытам пры абмеркаванні праблемы, выказваць і аргументаваць сваё меркаванне, рабіць высновы і падагульненні, удасканальваць камунікатыўныя ўменні, неабходныя для працы ў групе;
3) выхоўваць маральныя якасці асобы на аснове духоўнай спадчыны беларусаў.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант.**
*Настаўнік*
- Добры дзень! Бачу, што да ўрока ўсе падрыхтаваны. Старажытныя грэкі казалі, што **добры настрой – гэта палова перамогі**. Жадаю вам сёння на ўроку добрага настрою і поспехаў пры выкананні заданняў падчас нашай сумеснай працы. Спадзяюся, што сёння вы будзеце працаваць шчыра.
**ІІ. Арфаграфічная хвілінка.** "Правілы напісання слоў разам, праз злучок, асобна". На гэту работу вам 3 хвіліны.

1. Арфаграфічная хвілінка ( у табліцы пасля выканання задання павінна атрымацца лічба "9").

**Заданне**. У прапанаванай табліцы адзначце зорачкамі нумары слоў, якія пішуцца разам

*1).Па(малу), 2)сарві(галава), 3)заходне(еўрапейскі), 4)супер(маркет), 5(па)старым звычаі, 6) (у)шчыльную,7 (мед)работнік, 8) шасці(дзёнка), 9) (грос)майстар, 10) (міні)матч, 11) не(да)твару, 12) (контр)агент, 13) (звыш)гукавы, 14) (за)адно, 15) (у)пяцярых.*




*Адказ: (слайд 4)*

*Настаўнік.* Выканалі? Малайцы. А цяпер злучыце зорачкі ў табліцы. Што ў вас атрымалася ? *( адказы вучняў*). У каго атрымалася лічба “9”, той тэму ведае добра, а астатнім трэба паўтарыць правілы. Жадаю, каб і на сённяшнім уроку вы атрымалі такую адзнаку.

**<u>ІІІ. Матывацыйны момант.</u>**

**Настаўнік**. Якую з прыказак вы возьмеце з сабою на ўрок? Чаму? (Адказы вучняў)

1. Слухаць добрай рады не шкодзіць.
2. Не папрацаваўшы, ведаў не набудзеш.
3. Адклад не ідзе ў лад.
4. Як навучышся, так і ведаць будзеш.

Якая прыказка па сваёй структуры не падыходзіць да астатніх? Дакажыце чаму ? *(Адказы вучняў).*

Значыць, пра што мы будзем гаварыць на ўроку ? (*Пра складаназалежныя сказы, правілы пабудовы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку ў іх.)*

Вучні ставяць перад сабой задачы на ўрок.

**IV. Праверка дамашніх тэкстаў.** (2-3 вучніі)

**V. Работа з тэкстам.** Ці чулі вы такое імя: Язэп Драздовіч?



**Язэп Драздовіч.**
**«Сустрэча вясны на Сатурне»**



*(Слайд 8)*

Прачытайце тэкст.

**1) У фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі нямала прадметаў мастацтва, якія маюць не толькі еўрапейскую, але і сусветную каштоўнасць.** 2)***У <u>большай</u> ступені гэта творы жывапісу,***

***работы як айчынных мастакоў, так і прадс(Ц)таўнікоў іншых краін, чые карціны ў свой час былі набыты музеем.*** Для беларускага мастацтва імя Язэпа Драздовіча ўнікальнае і сімвалічнае.

Сучаснікі параўноўвалі Драздовіча з Леанарда да Вінчы па ўніверсальнасці яго інтарэсаў і захапленняў. Драздовіч вывучаў гісторыю, археалогію, этнаграфію Беларусі. Ён займаўся скульптурай, графікай, жывапісам, літаратурай, выкладаў.

У 1930-я гады Язэп Драздовіч ствараў свае касмічныя серыі. Дбайна вывучаў астранамічную літаратуру ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта і распрацоўваў свае тэорыі ўзаемадзеяння планет і праекты лятаючых касмічных апаратаў і ракет.

**3)У той час лічылі, што ўсе планеты заселены**. 4)***Сваю задачу як мастака Драздовіч бачыў у тым, каб падрабязна расказаць пра жыццё на іншых планетах***. У музейнай экспазіцыі прадстаўлены дзве яго жывапісныя работы з серыі “Жыццё на Сатурне”. 5)**Мастак стварае пейзажы, у якіх падрабязна паказваецца свет, убачаны ва ўяўных касмічных падарожжах**. Архітэктура, прырода, геаграфічныя асаблівасці на іншых планетах, адлюстраваныя аўтарам, шмат у чым нагадваюць зямныя пейзажы. У вугле карціны мастак абавязкова ставіў знак ці сімвал планеты, на адвароце дэталёва апісваў само месца.

***6) Сёння для даследчыкаў работы Язэпа Драздовіча - гэта ўнікальны прыклад навуковай фантастыкі, якая існавала ў беларускім мастацтве***. 7)**Гэта прыклад таго, як творчая асоба здольна выкарыстоўваць атрыманыя веды.**

*(Слайд 8)*

**VI. Хвілінка адпачынку.** Давайце з вамі паглядзім на карціны Язэпа Драздовіча. *(Слайд 9-12)*

**VII . Заданні да тэксту:**

- Якая тэма тэкста?
- Асноўная думка?
- Прыдумайце назву (“Унікальны прыклад навуковай фантастыкі”)
- 1. Сказ . Слова “фонд” у якім значэнні тут выкарыстана? *(Пасля адказаў звяраем лексічнае значэнне слова па слоўніку. Слайд15.)*

**ФОНД**

1. Грашовыя сродкі або матэрыяльныя каштоўнасці дзяржавы, прадпрыемства, якія выкарыстоўваюцца для розных мэт. *Фонд заработнай платы.*

2. Рэсурсы, запасы, рэзервы чаго-небудзь.

3. Сховішча рукапісаў, гістарычных дакументаў, старадрукаў і падобнае.

4. *(Толькі адзіночны лік)* Грашовыя сродкі, якія накопліваюцца шляхам збору на карысць каго-, чаго-небудзь. *Фонд міру.*

5. (Толькі множны лік) Каштоўныя паперы, якія даюць прыбытак у выглядзе вызначанага працэнта. *Банкаўскія фонды. Зніжэнне фондаў на біржы.*

6. (З азначэннем) Арганізацыя для аказання матэрыяльнай дапамогі творчым работнікам (пісьменнікам, мастакам і інш.). *Літаратурны фонд СССР.*

- 2 сказ . Назваць словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадаюць.

**ПРАДСТАЎНІКОЎ – [ПРАЦТАЎН′ ІКОЎ ]**

**( Спалучэнне [дс ] вымаўляецца як [ ц ]:**

**гарадскі [гарацк′і ] )**

**ІНШЫХ - [Й′ІНШЫХ ]**

**(Націскное і ненаціскное [ і ] вымаўляецца як [Й ′ І ] пад націскам у пачатку слова, пасля галоснага, пасля апострафа, ь, і ў)**

*Слайд 17*

- 3 сказ. Даць характарыстыку частак у сказе. *( 1 частка – няпэўна-асабовая, 2 – двухсаст, выказнік – заселены, кароткі дзеепрыметнік.)*
- 4 сказ. Чаму перад злучнікам “як” не ставім коску? *(ЯК= “у якасці”)*
- 5 сказ. Растлумачце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў 2 частцы сказа. *(Дзеепрыметнікавы зварот.)*
- 6 сказ. Растлумачце правілы пастаноўкі знакаў прыпынку. У чым фанетычная асаблівасць слова “даследчыкаў”? (*Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Даследчыкаў- Ч***)**
- 7 сказ. Растлумачце правапіс слова “атрыманыя”. (Атрыманыя – суфікс формаўтваральны.)

**VIII. Настаўнік.** Цікавасць да космасу існавала ў грамадстве вякамі. Пра гэта гавораць прыказкі і афарызмы. Назавіце вядомыя вам.

*(Для прыкладу слайд 13)*

1. **Наша касмічная сіла зямному пакою вартаўнік.**
2. **Хочаш у космас злятаць - умей веды набываць.**
3. **Ціск - як у касманаўта!**
4. **Не хапае зорак з неба.**
5. **Кожны чалавек носіць сваё неба з сабой. (Уладзімір Караткевіч)**

Як думаеце, ці актуальная сёння тэма космасу ў нашым грамадстве?

**21 сакавіка адбудзецца 21 экспедыцыя да МКС**




*Адказы вучняў. Слайд 19.*

Складзіце тэкст па малюнку з ужываннем складаназалежных сказаў. Тэма- “КОСМАС”.  Работа ў групах.

*(Кожная група выбірае сабе карцінку для работы , а потым спікера, які будзе агучваць тэкст, абараняць калектыўную думку.)*

Агучванне тэкстаў. *(Слайд 21-23)*







**IX.Падагульненне вывучанага.**

*Выкананне тэста*

**Тэставыя заданні**

**1. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:**

1) Там ніва не родзіць, дзе гультай ходзіць.

2) Каб бярозавік быў смачнейшы, бочку з сокам закопвалі на шэсць дзён у пясок.

3) Люблю часіну першых навальніц, калі вясёлая маланка зіхаціць, і калі яшчэ нясмела гром грыміць.

4) Сушэнне сыру, якое дазваляе надоўга захаваць гэты малочны прадукт мае ў нас даўнюю традыцыю.

5) Чуў я, што, калі на Стрэчанне раніцай выпадзе снег, то трэба чакаць ранняга ўраджаю.

**2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:**

1) Няўжо хто яшчэ сёння не ведае, што__ каб усё жыццё быць моцным, нельга адрывацца ад родных каранёў?

2) Плывуць па небе воблакі пуховыя і не кажуць__ куды.

3) Усе мы жывём у адным доме__ назва якому, вядома, Зямля.

4) Мецэнатам называюць чалавека, які неабыякавы да мастацтваў і навук__ і які фінансава падтрымлівае іх развіццё.

5) Каб сабраць адзін кілаграм нектару__ пчале даводзіцца абляцець да пяцідзесяці тысяч кветак.

**3. Выберыце правільную характарыстку сказа:**

Трэба прывучаць да сталых і сур’ёзных адносін да працы з малых гадоў для таго, каб яна давала плённыя вынікі.

1.Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай мэты.

2. Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай прычыны.

3. Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай спосабу дзеяння.

**X. Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія.**

*Настаўнік.* **Як навучышся, так і ведаць будзеш.**

Спадзяюся, вы падцвердзілі гэту ісціну. Праверце тэставыя работы. *(Узаемаправерка. Слайд 25.)*

Адказы: **1**. 1,2; **2**. 1,3,5; **3**. 1

Звярніцеся да вашых прагнозаў у пачатку ўрока і скажыце, ці дасягнулі вы сваёй мэты. (*Адказы вучняў)*

**XI. Інфармацыя пра дамашняе заданне.**

Параграф 11 (падрыхтавацца да тэставай работы), пр.170

**XII. Выстаўленне адзнак.**

## Карткі да ўрока

**Тэставыя заданні**

**1. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:**

1) Там ніва не родзіць, дзе гультай ходзіць.

2) Каб бярозавік быў смачнейшы, бочку з сокам закопвалі на шэсць дзён у пясок.

3) Люблю часіну першых навальніц, калі вясёлая маланка зіхаціць, і калі яшчэ нясмела гром грыміць.

4) Сушэнне сыру, якое дазваляе надоўга захаваць гэты малочны прадукт мае ў нас даўнюю традыцыю.

5) Чуў я, што, калі на Стрэчанне раніцай выпадзе снег, то трэба чакаць ранняга ўраджаю.

**2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:**

1) Няўжо хто яшчэ сёння не ведае, што__ каб усё жыццё быць моцным, нельга адрывацца ад родных каранёў?

2) Плывуць па небе воблакі пуховыя і не кажуць__ куды.

3) Усе мы жывём у адным доме__ назва якому, вядома, Зямля.

4) Мецэнатам называюць чалавека, які неабыякавы да мастацтваў і навук__ і які фінансава падтрымлівае іх развіццё.

5) Каб сабраць адзін кілаграм нектару__ пчале даводзіцца абляцець да пяцідзесяці тысяч кветак.

**3. Выберыце правільную характарыстку сказа:**

Трэба прывучаць да сталых і сур’ёзных адносін да працы з малых гадоў для таго, каб яна давала плённыя вынікі.

1.Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай мэты.

2. Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай прычыны.

3. Складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай спосабу дзеяння

<table>
<tr>
<td>Арфаграфічная хвілінка<br>1) Па(малу),<br>2) сарві(галава),<br>3) заходне(еўрапейскі),<br>4) супер(маркет),<br>5) (па)старым звычаі,<br>6) (у)шчыльную,<br>7) (мед)работнік,<br>8) шасці(дзёнка),<br>9) (грос)майстар,<br>10) (міні)матч,<br>11) не(да)твару,<br>12) (контр)агент,<br>13) (звыш)гукавы,<br>14) (за)адно,<br>15) (у)пяцярых.</td>
<td>У прапанаванай табліцы адзначце зорачкамі нумары слоў, якія пішуцца разам
<table>
<tr><td>1</td><td>2</td><td>3</td></tr>
<tr><td>4</td><td>5</td><td>6</td></tr>
<tr><td>7</td><td>8</td><td>9</td></tr>
<tr><td>10</td><td>11</td><td>12</td></tr>
<tr><td>13</td><td>14</td><td>15</td></tr>
</table>
</td>
</tr>
</table>

**Дадатак 1**

## Заданні да твора У. Караткевіча «Паром на бурнай рацэ» (8 клас)

**Картка 1.**

Уважліва прачытай словы ў левым слупку, знайдзі іх значэнне ў правым слупку. Спалучы словы з іх значэннем. Адказ запішы спалучэннем лічбаў і літар: 1А, 2Б, 3В і г. д.

| | |
|---|---|
| **1.** Карункі<br>**2**. Ягдташ<br>**3.** Абвахта<br>**4.** Каленкор<br>**5.** Фельд’егер<br>**6.** Шворка<br>7. Сапсан<br>**8.** Імпэтны<br>**9.** Барва<br>**10.** Балясы | **А.** Каравульнае памяшканне.<br>**Б**. Паляўнічая сумка для дзічыны.<br>**В.** Баваўняная тканіна.<br>**Г.** Ажурныя, сятчастыя вырабы з ільняных, шаўковых і іншых нітак для аздобы бялізны, адзення.<br>**Д.** Вяровачка, павадок.<br>**Е.** Сокал.<br>**Ж.** Ваенны кур’ер.<br>**З.** Густа-чырвоны колер.<br>**І.** Хуткі, парывісты, палымяны.<br>**К.** Агароджа з точаных фігурных слупкоў |

| **Картка 2.** Уважліва прачытай словы ў левым слупку, знайдзі іх значэнне ў правым слупку. Спалучы словы з іх значэннем. Адказ запішы спалучэннем лічбаў і літар: 1А, 2Б, 3В і г.д. | |
|---|---|
| **1.** Гарыпні<br>**2.** Брэцёр<br>**3.** Душагубка<br>**4.** Улан<br>**5.** Аказія<br>**6.** Сепаратыст<br>**7.** Ста´рык<br>**8.** Нерат<br>**9**. Фамільярнасць<br>**10.** Цывільны | **А.** Салдат або афіцэр коннай арміі.<br>**Б**. Заўзяты дуэлянт.<br>**В.** Рыбалоўная прылада.<br>**Г.** Старое перасохлае рэчышча.<br>**Д.** Гульня; назва ад прыпеву «Гары-гары, пень».<br>**Е**. Не ваенны, грамадзянскі.<br>**Ж.** Вузкая, няўстойлівая лодка.<br>**З.** Развязнасць, беспрынцыповасць.<br>**І.** Зручны выпадак для якой-небудзь справы<br>**К.** Прыхільнік адасаблення нацыянальнай меншасці. |

| **Картка 3.** **Пазнай героя** | |
|---|---|
| **1.** Фельд’егер<br>**2.**Пора-Леановіч<br>**3.** Юрый Гораў<br>**4.** Іван<br>**5.**Жонка Усяслава Грынкевіча | **А.** Сухі прыгожы твар, белыя валасы і бакенбарды і, галоўнае, страшнаватыя блакітныя вочы, у якіх відна была пагарда да ўсяго. І яшчэ рэзкі шрам паўз брыво і левую скронь.<br>**Б.** Ён ніколі не ведаў, ніколі нават не мог падумаць, што на яго можа ўпасці такое падазрэнне. Ён стаяў, моўчкі хапаючы ротам паветра. Бялявыя хвалістыя валасы прыліплі да спатнелага лба, глыбокія сінія вочы сталі жаласнымі.<br>**В.** Рэзкі чырвоны твар сапраўднага салдафона, быў мокры. З-пад салдацкай бесказыркі вісела пасма |

| | |
|---|---|
| | рэдкіх засівелых валасоў. кожны пазнаў бы ў ім старога, бывалага салдата.<br>**Г.** Мае славу першага ў палку, і не толькі ў палку, брэцёра…страляе толькі дуэльнымі пісталетамі.<br>**Д.** Густыя цёмныя бровы, як чорныя азёры, бліскучыя вочы і прыпухлы маленькі рот. Прамы невялічкі нос, мяккі авал трохі асіметрычнага аблічча, якому самая гэтая асіметрычнасць надавала дзіўны выраз мяккай пакорлівасці і адначасова ўладнасці, нават прывычкі ўладарыць.<br>**Е.** Гэты чалавек падобны на сціснутую спружыну, якую лёгка выпусціць з палону, і тады яна б'е — да смерці.<br>**Ж**. Выраз ягонага твару быў выразам афіцыйнай адданасці і пачцівасці, праз які відочна праглядала лёгкая пагарда і свая, незамаскіраваная, думка аб усім.<br>**З.** Страшны, вельмі небяспечны чалавек, драпежнік, у якога, пэўна, зусім няма ў душы месца для так званых пакут сумлення. |

| **Картка 4.** ***Устаў прапушчаныя словы.*** | |
|---|---|
| **1.** На левы, проціleглы гораду бераг Дняпра **1**____выслаў роту выпрабаваных у баях салдат пад камандай капітана 2____.<br>**2.** Капітану не вельмі верылі як нашчадку сепаратысцкай фаміліі і ўраджэнцу ______.<br>**3.** Таму « ў дапамогу яму » і на «адпачынак» паставілі таксама капітана _______ карэннага русака са старой маскоўскай фаміліі.<br>**4.** _______быў ранены ў сутычцы з атрадам паўстанцаў пад Ракавам і адасланы «ў тыл».<br>**5.** У канцы ліпеня __________даў загад знішчыць на Дняпры ўсе чаўны.<br>**6**. Кіраўнік атрада _______ быў узяты ў палон і асуджаны на смерць.<br>**7.** 18 жніўня на кардон прыляцеў улан на ўспененым кані і нешта хутка перадаў ________. | **А.** Юрый Гораў<br>**Б.** Пора-Леановіч<br>**В.** Фікельмонт<br>**Г.**Усяслаў Грынкевіч<br>**Д**. Іван |

| | |
|---|---|
| **8.** ________пераправіў конніка на другі і са шкадобаю глядзеў, як жывёла, амаль па-чалавечы стогнучы, выносіла ўлана на стромы чырвоны адхон.<br>**9.** Маменька, пэўна, паехала цяпер у манастыр, маліцца за здравіе _____і каб Бог дараваў яму веру.<br>**10.** А вось і сам ён, _____, выходзіць з парадных дзвярэй, праходзіць дарожкай пад ліпамі, з насалодаю дыхаючы празрыстым і ўжо схаладнелым паветрам. | |

| **Картка 5.** ***Пазнай героя па рэпліцы.*** | |
|---|---|
| 1. Прахожыя могуць сунуцца ў ваду на звычайным пераездзе цераз старык... Дазвольце там каравул паставіць... Могуць патапіцца.<br>2. Мы вельмі любім народ. Каб зручней залазіць яму ў кішэнь.<br>3. Нікога не шкадуй для сваёй мэты... Пакуль у сілачку не ўваб'ешся — маўчы, слухайся і паступова прывучай усіх баяцца сябе... А там — не шкадуй. Ні жанчын, ні дзяцей. Ідзі па трупах, і добра табе будзе.<br>4. Воля патрэбна ўсім. А нам, беларусам, рускім, палякам, — больш за ўсіх. Бо мы штодня без яе паміраем у пакутах.<br>5. Я вязу памілаванне… Замянілі пажыццёвай катаргай.<br>6. А галчаняткі... бедныя. Познія. Гняздо раскідана. Страшная штука ўраган. Дзе хавацца? На якой зямлі?<br>7. Галоўнае — стаць на той бок, які выйграе.<br>8. Вайна вайною, а баб шкада... Вельмі баб шкада...<br>9. А адкуль у вас рыба ў юшцы? Што ж нам, на кашы сядзець? Калі самі сабе не паможам...<br>10. Для асуджанага кожная гадзіна чакання — гэта лішнія маральныя пакуты. | **А.** Фельд'егер<br>**Б.** Пора-Леановіч<br>**В.** Юрый Гораў<br>**Г.** Іван<br>**Д.** Жонка Усяслава Грынкевіча |

| **Картка 6.** **Пазнай героя па рэпліцы.** |
|---|

| | |
|---|---|
| 1. Божа, нават рэкі цякуць малаком. І на гэткай зямлі, поўнай даброшчаў, паміраць? І такой светлай раніцай чакаць смерці? Ну не, няхай хоць на дзве гадзіны скараціць такое чаканне — і то добра. Я не шкадую.<br>**2.** Сілы пашкадуй, дзіцятка. Да конскіх могілак дзве вярсты... у цемры.<br>**3.** Вайсковы загад не можа датычыцца жанчыны, якая вязе літасць свайму мужу. І той не афіцэр, хто не дапаможа жанчыне ў такіх абставінах.<br>**4.** Ён замяняе страту пажыццёвай катаргай і пасылае жанчыну. А за дзве гадзіны да гэтага з губернатарскай поштай пасылае фельд'егера, каб на месцы паспяшаліся.<br>5. Як яна магла зрабіць такую дарогу за сорак восем гадзін — не ведаю. Гэта трэба быць жалезным чалавекам...<br>**6.** Спазнілася хвілін на дзесяць. Яна амаль да абвахты падышла, а тут на задворках як каленкор2 ірванулі.<br>**7.** Зусім не плакала. Толькі і сказала: «Божа, пакарай іх...» Не шкадавала. Я б такую бабу, што мужа не шкадуе, кожны дзень лейцамі аходжваў.<br>**8.** Пісталет... пісталет у багну. Дзякуй вам... Дзякуй...<br>**9.** У Вільню. Да Мураўёва. Я даб'юся ў яго аўдыенцыі і не пабаюся сказаць, што думаю пра яго.<br>**10.** Дай вам Бог шчасця. І вам, і дзецям, і ўсім нашчадкам вашым. Дай Бог, каб мае ўнукі ніколі не варагавалі з вашымі. | **А.** Фельд'егер<br>**Б.** Пора-Леановіч<br>**В.** Юрый Гораў<br>**Г.** Іван<br>**Д.** Жонка Усяслава Грынкевіча |

**Дадатак 2**

**Заданні да твора Якуба Коласа "Хмарка"**

| |
|---|
| **КАРТКА 1.**<br>**Пазнайце герояў твора. Устаўце прапушчаныя словы.** |

**1.** Можа, затым _______ і была такая шчаслівая, што нічога не ведала аб белым свеце.
**2.** Яна не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна; не ведала нават, ці ёсць у яе____.
3. У_______, відаць, было нейкае свята ў гэту раніцу, або добра нагуляўся ён дзе за ўчарашні дзень, бо яшчэ не варушыўся і спаў, хоць сонейка падбіралася пад поўдзень.
4. Даўганосы ______ і вухам не вёў на плявузготу сярдзітай суседкі, а любоўна цешыўся са сваіх дзетак.
5. І паплыла паволі ________ ў далёкую-далёкую дарогу, дзе застанаўляючыся, як прыемная думка, дзе кіруючыся на малюнкі, што найбольш зацікаўлялі яе.
6. ________ перасталі спяваць і пахаваліся пад лісток лотаці. Гэта яны спявалі песню ў гонар Хмаркі, а яна так зняважыла іх.
7. Там ________ выплакалі апошнія слёзы, каб даць табе жыццё.
8. — Адкуль прыпаўзла, нябога? — спытала _________ Хмарку.
9. — Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы, — сказаў __________на гутарку Хмаркі. — Быў і я ў тых краях, адкуль праблуталася імасць1. Там, гаворыш, — шчасце? А што ж, па-твойму, няшчасце?
10. Стары _________, абмыўшыся дажджом, павесялеў і сказаў да Бусла, з якім даўно ўжо быў у дружбе: — От навука для тваіх дзяцей…

**Картка 2.**

**Паразважайце на тэму : *“Здалёку ўсё з’яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая ўжо натура і схільнасць нашай душы — бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі”.***



**Картка 3.**

**Паразважайце на тэму:** *“Уласнае шчасце не дае мажлівасці прымеціць чужое гора.”*



**Картка 4.**

**Паразважайце на тэму:** ***“Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы.”***





**Картка 5.**

**Паразважайце на тэму:** ***“Не лётайце дарэмна па свеце, не бадзяйцеся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага”.***

**Картка 6.**

**Знайдзіце урывак твора, што адпавядае малюнку, выразна прачытайце яго.**



**Картка 7.**

**Папрацуйце з тэкстам. Паназірайце, якая Хмарка ў пачатку і ў канцы тэксту. Якія словы для характарыстыкі гераіні выкарыстоўвае аўтар? Запішыце свае назіранні. Зрабіце вывад: як змянілася гераіня? Чаму?**

| У пачатку | У канцы |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**Дадатак 3**

**Карткі да твора Г. Далідовіча «Губаты» (8 клас)**

**Картка 1.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 2.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 3.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**




**Картка 4.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 5.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 6.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 7.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 8.**

**Уважліва паглядзі на малюнак. Знайдзі ў тэксце ўрывак, які адпавядае гэтаму малюнку. Выразна зачытай яго.**



**Картка 9.**

**Размясці нумары малюнкаў у такім парадку, у якім гэтыя эпізоды ідуць у тэксце.**

| | | |
|---|---|---|
| 1.  | 2.  | 3.  |
| 4.  | 5.  | 6.  |

**Дадатак 4**

**Заданні да твора Тараса Хадкевіча «Крынічка»**

*Дарагі дружа, самастойна адкажы на пытанні і выканай заданні да твора* ***Тараса Хадкевіча “Крынічка”.*** *Для таго, каб паспяхова справіцца з задачай, патрэбна прачытаць тэкст 2 разы. На працягу адказаў можна пастаянна звяртацца да зместу твора.*

**1. Да якой ракі «імклівыя струменьчыкі праклалі ў траве і прыбярэжным пяску раўчукі»?**

**2. Кожны з герояў бачыў і адчуваў крынічку па-свойму. Суаднясіце ўрыўкі з твора з тымі героямі, да якіх яны адносяцца. Адказ запішыце з дапамогаю літар і лічбаў. Напрыклад: А1, Б2…**

| | |
|---|---|
| **А.** Мог ўбачыць, “як нізка пырхаюць, кружацца над ёй птушкі, любуючыся сабой, як у люстэрку. І кружацца, і спяваюць, прыхарошваючыся”. | |
| **Б.** Бачыў, “як глыбока на дне варушацца жвір і каменьчыкі, нібы нехта нябачны гуляе з імі, і чуеш, як плюскоча крынічка, быццам яна размаўляе з табой”. | **1.** Петрык. |
| **В.** Гаварыў, што “ў летнюю месячную ноч расчэсвае каля крынічкі свае шаўкавістыя косы русалка”. | **2.** Нічыпар |
| **Г.** Яму здаецца, “што яна жывіць Дзвіну, і каб не было такіх крынічак, не было б і той прыгажосці, якой дыхае светлаплынная Дзвіна з яе раскошнымі, гаманлівымі берагамі” | |
| **Д.** Лічыў, што калі нап’ешся з крынічкі вады, то “ адчуваеш, як у цябе прыбавілася бадзёрасці і сілы”. | |
| **Е.** Быў упэўнены, што “калі які злы паляўнічы-браканьер параніць у лесе беланогага прыгажуна ляся, дык лось прыходзіць сюды, п’е з крынічкі, і рана неўзабаве загойваецца. | |
| **Ж.** Яму здаецца, што яна расказвае нешта нязнанае, таямнічае | |

**3. У творы вам сустрэліся словы, якія ўжываюцца нячаста. Вы пазнаёміліся з іх значэннем. Звярніцеся да табліцы і суаднясіце словы і іх лексічнае значэнне. Адказ запішыце з дапамогаю літар і лічбаў. Напрыклад: А2, Б1, В3.**

| | |
|---|---|
| А. Жвір | 1. Самаробны кубак для піцця вады. |
| Б. Карэц | 2. Абрывісты, круты бераг ракі. |
| В. Круча | 3. Буйны пясок. |

**4. З чаго быў зроблены карэц? Адказ запішыце назоўнікам у пачатковай форме.**
**5. Кім працаваў майстар, што зрабіў карэц? Адказ запішыце з дапамогаю назоўніка ў пачатковай форме.**
**6. Каму " прыемней было піць не з карца, а прылёгшы грудзьмі на край крынічкі"?**
**7. У тэксце Т. Хадкевіч выкарыстаў фразеалагізм са значэннем "уважліва, даверліва і з захапленнем слухаць каго-небудзь". Знайдзіце яго і запішыце ў той форме, у якой ён ужываецца ў тэксце.**
**8. З чым аўтар параўноўвае крынічку?**
**9. Твор "Крынічка" мае своеасаблівую будову. Узнавіце правільны парадак асобных частак гэтага твора. Запішыце адказ ланцужком лічбаў. Напрыклад: 5,3,1,6,2,4.**
1. Крынічка і Петрык.
2. Бурліць, плюскоча крынічка.
3. Ці ёсць у Дзвіне русалкі?
4. На краі кручы.
5. Аповеды старога Нічыпара.
**10. Уявіце, што вы таксама трапілі да той крынічкі. Запішыце свае ўражанні ад гэтай сустрэчы** (3-5 сказаў).

**Адказы:**
**1. Да Дзвіны.**
**2. А2, Б1, В2, Г1, Д1, Е2, Ж1.**
**3. А3, Б1, В2.**
**4. Бяроста.**
**5. Пастух.**
**6. Петрыку.**
**7. Распусціў вушы.**
**8. З люстэркам.**
**9 . Адказ: 4, 1, 5, 3, 2**
1. На краі кручы.
2. Крынічка і Петрык.
3. Аповеды старога Нічыпара.
4. Ці ёсць у Дзвіне русалкі?
5. Бурліць, плюскоча крынічка.

**Дадатак 5**

**Заданні да тэксту «Людская ўдзячнасць»**

**Тэкст**

[1]Як вядома, медаль у чалавечым грамадстве не *з..яўляецца* актам поўнага прызнання заслуг. [2]Поўнае і *а..салютнае* прызнанне —гэта помнік. [3]Помнікі ва ўсім *с..веце* ставяць не толькі людзям, але і жывёлам.

[4]У італьянскім горадзе Борга-Сан-Ларэнца пастаўлены помнік *сабак..* . [5]Ён заўсёды сустракаў гаспадара на аўтобусным прыпынку. [6]Аднойчы той не прыехаў (здарыўся *ня..часны* выпадак). [7]Сабака не мог зразумець гэтага і хадзіў да аўтобуснага прыпынку некалькі гадоў запар. [8]Калі сабакі не стала, жыхары горада сабралі грошы і паставілі помнік сабачай вернасці. [9]Помнік маламуту па мянушцы Бальт устаноўлены аж у двух месцах: у парку Нью-Ёрка і ў аляскінскім горадзе Норм. [10]Так былі прызнаны заслугі сабакі за дастаўленую вакцыну, што ратавала ад эпідэміі дыфтэрыі дзяцей гэтага паўночнага *гара..ка*.

[11]У [а)]*Пецярбург..* па патрабаванні акадэміка І. Паўлава ў 1935 годзе быў [б)]*а..крыты* помнік сабаку. [12]Ён стаіць на [а)]*тэ..ыторыі* Інстытута эксперыментальнай [б)]*мед..цыны* і [в)]*све..чыць* пра ўдзячнасць вучоных жывёлам- сваім маўклівым [г)]*памо..нікам* *(Паводле А. Ханіна).*

**Заданні да тэксту**

***Прачытай уважліва тэкст, выканай заданні.***

Заданне 1. Сфармулюйце тэму тэксту. ________________________________

Заданне 2. Сфармулюйце асноўную думку. ___________________________

Заданне 3. Устаўце прапушчаныя літары ў выдзеленыя словы:

1 сказ __; 2 сказ ___; 3 сказ __; 4 сказ ___; 6 сказ___; 10 сказ___;

11 сказ: а) __; б) __; 12 сказ: а) ___; б) ___; в) __; г) __ .

Заданне 4 . Як вы разумееце слова “запар”, што знаходзіцца ў 7 сказе? Растлумачце яго значэнне. ________________________________________

Заданне 5. Як вы разумееце слова “маламут”, што знаходзіцца ў 9 сказе? Растлумачце яго значэнне. ________________________________________

Заданне 6. Запішыце нумары сказаў, у якіх ёсць дзеепрыметнікі: _______

Заданне 7. Запішыце дзеепрыметнік, ужыты ў кароткай форме.

Заданне 8. Запішыце дзеепрыметнік, які ў сказе выконвае ролю азначэння. ______________________________________________________

Заданне 9. Запішы дзеепрыметнікі, што ўжытыя ў поўнай форме, а ў сказе выконваюць ролю выказнікаў:

Заданне 10. Якія вы ведаеце помнікі жывёлам, устаноўленыя ў Беларусі? Чаму гэта зроблена? Як вы лічыце, ці патрэбны такія помнікі? Запішыце свой адказ у выглядзе невялікага тэксту.

**Дадатак 6**

**Заданні да тэксту "Прытча"**

**Прытча**

[1]Адзін чалавек, які ўц..леў пасля *карабле(крушэння)*, быў выкінуты хваляй на бязлюдны востраў. [2]Штодня ён узіраўся ўдалячынь і чакаў, што міма праплыве *які(небудзь)* карабель і выратуе яго.

[3]Але дні ішлі, а гарызонт быў пусты. [4]Чалавек вырашыў збудаваць с..бе *(не)вялікі* шалаш з уцалелага ад карабля бярвення, каб абараніцца ад дажджу і звяроў.

[5]Аднойчы ён вярнуўся пасля пошукаў ежы і ўбачыў шалаш а..утаны полымем. [6]Дым уздымаўся слупам да самага неба. [7]Разам з шалашом былі страчаны ўсе яго запасы. [8]Чалавек застаўся ні з чым. [9]Ахоплены а..чаем ён чакаў смерці.

[10]А раніцай наступнага дня яго пабудзіў карабельны гудок.

— [11]Як вы даведаліся, што я тут? — спытаў чалавек у матросаў.

— [12]Мы ўбачылі твой дымавы сігнал, — а..казалі яны.

[13]Памятай чалавек: калі раптам твой маленькі шалаш згарыць дашчэнту, гэта можа быць сігналам для твайго выратавання.

**Заданне 1**. **Уважліва прачытайце тэкст.**
**Заданне 2.** Вызначце стыль тэксту. Адказ запішыце.
**Заданне 3.** Вызначце тып маўлення. Адказ запішыце.
**Заданне 4.** У якім сказе выражаецца асноўная думка гэтага тэксту? Запішыце № гэтага сказа.
**Заданне 5.** У якім сэнсе ўжыта слова «***шалаш***» у апошнім сказе? Растлумачце, якое лексічнае значэнне, на ваш погляд, аўтар надаў гэтаму слову?
**Заданне 6.** Як вы лічыце, што такое прытча? Адказ запішыце.
**Заданне 11**. Запішыце нумары сказаў, у якіх ёсць парушэнні пастаноўкі знакаў прыпынку пры дзеепрыметнікавым звароце.
**Заданне 12.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з'яўляюцца азначэннем.
**Заданне 13.** Запішыце нумары сказаў, у якіх дзеепрыметнікі з'яўляюцца выказнікам
**Заданне 14.** Прачытайце сказ № 13. Замяніце яго сваім кароткім (2-3 сказы) павучальным вывадам, звярнуўшыся да аднагодак-сямікласнікаў.

**Дадатак 7**

**Заданні да тэксту «*Я з вогненнай вёскі*»**







[1]*Сёлета* спаўняецца 45 гадоў кнізе “Я з вогненнай вёскі…”, дакументальнаму зборніку успамінаў, кні..е(памяці) пра вынішчэнне нацыстамі беларускіх вёсак падчас Вялікай Айчыннай вайны. [2]Успаміны сбіралі беларускія пісьменнікі Алесь Адамовіч, Уладзімір Калеснік і Янка Брыль. [3]Пісьменнікі *аб’ездзілі* на працягу 1970—1973 гадоў 147 вёсак у 35 раёнах Беларусі і сабралі ўспаміны больш як 300 непасрэдных сведкаў, якія цудам ацалелі.

[4] “Я з вогненнай вёскі…”- гэта жывы голас людзей, што былі спалены, забіты разам з сям’ёй, разам са сваёй вёскай, і якія выжылі. [5]Як у прадмове напісалі самі аўтары, у кнігу ўвашлі ўспаміны толькі тых, якія самі пражылі жудасны лёс сваіх аднавяскоўцаў. [6]На шляху збіральнікаў чалавечай памяці шмат было і такіх вёсак, дзе не ацалеў (не,ні)хто. [7]На старонках гэтай кнігі сабраліся людзі, што выйшлі з агню, з-пад зямлі. [8]І гэта – у самым рэальным, не пераносным сэнсе. [9]Людзі з вогненных вёсак сабраліся на старонках гэтай кнігі, каб *све..чыць*, пытацца, судзіць, каб распавесці тое, пра што ведаць – страшна, а забыцца – небяспечна.

**Ліст заданняў да тэксту «Я з вогненнай вёскі»**

Імя, прозвішча______________________________________. Клас __________

1. Дайце тэксту загаловак. ___________________________________________

2. Якая тэма тэксту? Запішыце адказ.__________________________________

3. Вызначце стыль і тып тэксту. ______________________________________

4. Вызначце часцінамоўную прыналежнасць выдзеланага курсівам слова ў 1 сказе. ___________________________________________________________

5. Запішыце падкрэсленыя ў 1 сказе словы правільна, уставіўшы прапушчаную літару і раскрыўшы дужкі. Растлумачце напісанне.

______________________________________________________________________

6. Знайдзіце ў 2 сказе арфаграфічную памылку. Запішыце слава правільна.

______________________________________________________________________

7. Падкрэсленыя ў 3 сказе лічэбнікі запішыце словамі, пастаіўшы іх у адпаведную форму.________________________________________________

8. У чым фанетычная асаблівасць слова, выдзеленага курсівам ў 3 сказе? Зрабіце гукавы запіс гэта слова._______________________________________

9. Вызначце часцінамоўную прыналежнасць падкрэсленых у 4 сказе слоў. Якім членам сказа яны з’яўляюцца?____________________________

10. Знайдзіце ў 5 сказе арфаграфічную памылку. Запішыце слава правільна.__________________________________________________________

11. Запішыце правільна падкрэсленае ў 6 сказе слова.__________________

12. У 9 сказе ўстаўце прапушчаную літару ў выдзеленае курсівам слова. Запішыце яго ў той форме, у якой яно стаіць у тэксце.__________________

13. Ці актуальная гэта кніга сёння? Паразважайце. Свае меркаванні запішыце. _____________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________

**Дадатак 8**

**Творчыя работы вучняў**

**Сачыненне па малюнку з выкарыстаннем фрагмента тэксту "Бліны"**

## Школьны псіхолаг



Учора быў бацькоўскі сход? Вы, адчуваючы набліжэнне "грому і маланак", вырашылі легчы спаць яшчэ да таго, як бацькі вярнуліся дамоў? Як пазбавіць сябе ад добрай узбучкі? Гэтае пытанне рана ці позна задае сабе любы школьнік. У нас ёсць для вас надзейны сродак вырашэння такой праблемы. СНЯДАНАК ДЛЯ БАЦЬКОЎ! Не проста кубак гарбаты і бутэрброд, а нешта смачнае, сытнае, карыснае і пры гэтым такое, што не патрабуе ад вас шмат часу. Вы ўсё яшчэ не здагадаліся, што гэта? Ну, вядома ж, блінцы!

Для гэтага трэба ўзяць неабходныя ігрэдыенты:

- малако - 660 мл;
- яйка - 2 шт .;
- мука - 445 г;
- цукар - 10 г;
- алей - 45 мл;
- масла сметанковае.

Разбіваем яйкі ў місачку, уліваем малако і ўзбіваем міксерам. Затым, не выключаючы прыбор, усыпаем просеяную загадзя муку і змешваем. Следам кідаем цукар і ўліваем алей. Выліваем цеста на разагрэтую патэльню тонкім пластом і выпякаем бліны з абодвух бакоў. Пасля гэтага перакладваем іх на талерку і прамазваем сметанковым маслам.

Вашыя бацькі будуць у захапленні і забудуць пра ўсё на свеце ад такога неверагоднага сняданку. Не забудзьце толькі пажадаць ім добрай

раніцы, паведаміць, што ў школу вам сёння трэба выйсці значна раней, і, выбягаючы з кватэры, крыкнуць: ”Смачна есці!”.
P.S. Калі адчуваеце, што за ноч у бацькоў жаданне тэрмінова з вамі пагаварыць не знікла, лепш не карыстайцеся міксерам, вазьміце відэлец. З ім вы ўсё зробіце ціха, не патурбуеце бацькоў!

Чуб Іван

**Фокуснік**



О мае смачненькія, мае залаценькія блінчыкі! Як жа зрабіць так, каб вы заўсёды былі са мною!? Вы ж мая асалода, маё натхненне! Я ведаю! Трэба прыдумаць кулінарны фокус для сваіх прыхільнікаў, а потым яшчэ і частаваць іх блінцамі! Так, трэба схаваць у прышытыя кішэні ды ў рукавы ўсе падрыхтаваныя інгрэдыенты:

- малако - 660 мл;
- яйка - 2 шт .;
- мука - 445 г;
- цукар - 10 г;
- алей - 45 мл;
- масла сметанковае.

Не забыць місачку, у якой буду замешваць цеста! Яе я схаваю у сваім адноўленым чароўным капелюшы. А як жа гэтыя блінцы мне спячы? У чароўны плашч схаваю прыдуманую і створаную мною пліту для выпякання блінцоў. Усё, гатовы! Цяпер магу працаваць у сваё задавальненне! Што ні выступленне - то блінчык мне ды пачастункі гледачам! Цяпер у мяне прыхільнікаў будзе значна больш! Эх, разбагацееею! Толькі давядзецца набыць новы, спецыяльна пашыты касцюм, бо і сам хутка стану кругленькі, як блінок.

Шусціцкая Маргарыта

**Дадатак 9**

**Творчыя работы вучняў**

Васілю Быкаву

У кабінеце ціха і спакойна:
Ні гоману, ні смеху не чуваць.
Па шчоках слёзы прабягаюць спорна.
Ды вусны сціснуты, агні ў вачах гараць.

Пятрок і Сцепаніда - вось прычына
І роспачы, і болю ў грудзях.
Дзіцячы смех іх лёс адрынуў,
Іх катаванне выклікае жах.

Вайна так ясна, страшна, бы наяве,
Адкрыла пашчу, дыхае агнём.
Нянавісцю да ўсёй фашысцкай зграі
Напоўніліся сэрцы да краёў.

І ўжо не раз пра гора і пакуты
Любімы Быкаў нам распавядаў,
Каб не забылі драцяныя путы,
Каб помнілі пра злосць свінцовых джал.

Іван і Джулія не зведалі кахання,
А Глечык маму не паспеў абняць…
Карпенку сын не ўсміхнецца на світанні,
А Тэклі Васіля ўсё жыццё чакаць.

І Дзёмчыха не выйдзе да суседак,
А Сотнікаву здрады больш не знаць,
Дзяўчынцы Басі ўжо не цешыцца між дзетак -
Усім вайна атруту смерці змагла даць.

Я ўдзячна Вам, шаноўны Васіль Быкаў,
За тое, што змаглі нам расказаць,

Як жураўліны клін іх душы клікаў,
Як кожны жыць хацеў - не паміраць!

Я ўдзячна Вам за тое, што ў сэрцах
Змаглі Вы абудзіць агонь,
Што разарвалі  словам  у душах дзебры,
Змаглі данесці, што такое боль.

Мы зразумелі сілу мірнай працы,
Спазналі шчасце ад спакойных дзён.
І генетычна ненавідзім звадкі,
Жадаем жыць, любіць, чуць птушак звон.

Мы ў сваю краіну не прапусцім
Вайны пачвар крывавых злую раць.
І разам з Быкавым заўсёды будзем
Да шчасця, свету, міру заклікаць.

Карына Старынская

## Пасланне ветэрану

Ужо хутка май у квецені заззяе,
Святочных песень будзе чуцен звон.
Мне так цябе, мой прадзед, не хапае
У гэтым садзе, што сабраў нас зноў.

Фарбую дрэвы, кветкі даглядаю,
А прад вачыма – той цудоўны сон,
Дзе ты жывы, дзе ўся сям'я ў маі
Збіралася ў садзе за сталом.

Быў гоман, шум ды жарт рознагалосы,
Усе беглі басаནож па скошанай траве,
А я, зусім малы, светлавалосы,
Сядзеў шчаслівы на каленях у цябе.

Твой гонар, праўнук, цёзка, твой нашчадак…
Я помню ўсмешку, цёплы бляск вачэй
Ды звон узнагарод, малому-цацак…
Пусты рукаў падшыты, так было ямчэй.

Зайду ў хату, каб сустрэць твой позірк.
Слязінка-здрадніца спяшае па шчацэ.
Мне ў гэтым годзе споўніцца ўжо столькі ж,
Як у пачатку той вайны было табе.

Прайшоў праз ад і слёзы, зведаў страты.
Пакуты, боль ірвалі цела і душу.
Ты выйшаў параможцам з той навалы,
Твой ген я з гонарам у сваёй крыві нашу.

Мой прадзед, май у квецені заззяе,
Святочных песень у садзе будзе чуцен звон.
Хоць мне цябе так моцна не хапае,

Маіх унукаў тут збярэш ты зноў.

Каштан Аляксандр

## Заключэнне

Працуючы ў межах інавацыйнага праекта, прыйшла да высновы, што актыўная работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры дае свой вынік. Ад пачатку і да канца праекта праводзіла дыягностыку вучнёўскіх работ. Заўважана, што ў 7 класе дзеці няўважліва чыталі тэкст, з цяжкасцю ўзнаўлялі змест, а да выканання творчых заданняў прыступалі толькі некаторыя з іх. На ўроках літаратуры больш прываблівалі такія прыёмы, як «Устаў прапушчаныя словы», «Пазнай героя», «Пазнай героя па рэпліцы». Тлумачыцца гэта тым, што вучні разумелі: за заданні, выкананне якіх патрабуе і дапускае карыстанне тэкстам, можна атрымаць станоўчую адзнаку.

Цяжэй даваліся заданні «Кругавы пераказ», «Чытанне са сцікерамі», «Так ці не», «Веру - не веру», «Ці верыце вы, што…?», «Карэктар». Тут патрабавалася пэўная доля самастойнай падрыхтоўкі, а скарыстацца тэкстам, асабліва матэрыялам вялікага памеру, можна было толькі тады, калі ён ужо сапраўды вядомы. Але ж і адзнакі былі вышэйшыя.

З часам работа з тэкстам усё больш прываблівала, станавілася зразумелай і лёгкай, таму многія вучні браліся за заданні творчага плану. Іх значна цяжэй выконваць, але пры гэтым яны даюць магчымасць праявіць сябе, выказаць свае думкі і погляды, атрымаць максімальна высокія адзнакі. Цяпер многія дзеці з задавальненнем бяруцца за такую работу. Вучням цікава ствараць старонкі героя ў сацыяльных сетках, «браць інтэрв'ю» ў любімых герояў, пісаць працяг аповеду. Вельмі падабаюцца заданні «Сцэнарыст», «Кастынг-дырэктар», «Спробы пяра», «Я хацеў бы сустрэцца з Вамі …», «Ліст да героя».

Што датычыцца ўрокаў беларускай мовы, то творчыя заданні аказаліся для дзяцей значна цяжэйшымі. Прыдумаць аповед, фантазіраваць пра падарожжы і незвычайныя сустрэчы, стварыць маналогі для разнастайных герояў- усё гэта аказалася ўжо ў 8 класе для большасці вельмі захапляльным, цікавым і нават простым. Самае цяжкае – максімальна дакладна і коратка выказаць сваю думку. Да творчых заданняў, што даю на ўроках мовы, часта даецца патрабаванне: малы памер (ад 2 да 6 сказаў). Калі сталі прыдумваць слоганы, рэкламныя праекты, памяткі-парады, то ўбачылі, што напісаць паўнавартасны тэкст малога памеру значна цяжэй. У дзевяцікласнікаў такая работа выклікае

цікавасць, але пакуль не ўсе з іх выдатна спраўляюцца. Для гэтага трэба мець добры лексічны запас, востры аналітычны розум, неабходна ўмець сканцэнтраваць увагу на самым галоўным. Вучні імкнуцца дасягнуць новай мэты, стараюцца навучыцца, бо разумеюць, што сённяшні дзень якраз патрабуе менавіта тэкстаў такога фармату. І таму наша праца працягваецца. Мы вучымся… І нам дапамагае ТЭКСТ.

**Спіс літаратуры**


1. Валочка, Г. М. Фарміраванне чытацкай пісьменнасці ў працэск навучання беларускай мове / Г. М. Валочка // Роднае слова.-2017. №6.- С. 50-54.
2. Васюковіч, Л. С. Вучэбны тэкст у школьным падручніку па беларускай мове / Л. С. Васюковіч. – Мінск, 2005.
3. Да глыбінь тэксту: вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А. І. Даніш, Ст. Р. Рачэўскі.
4. Казачэнка, І. Р. Тэкстацэнтрычны падыход як неабходная ўмова фарміравання камунікатыўнай кампэтэнцыі вучняў / І. Р. Казачэнка // Роднае слова. – 2016. – № 7. – С. 54–56.
5. Рачэўскі, С. Тэкст як полідыдактычная адзінка навучання беларускай мове ў школе / С. Рачэўскі // Роднае слова. – 2021. – № 5. – С. 63– 65.
6. Цукерман, Г. А. Становление читательской грамотности, или Новые похождения Тяни-Толкая / Г. А. Цукерман [і інш.] // Вопросы образования. – 2015. – № 1. – С. 284–300.

Вучэбна-метадычнае выданне

Валошчык Таццяна Сцяпанаўна

Работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы і літаратуры
як сродак фарміравання чытацкай граматнасці вучняў

(з вопыту работы)

Метадычны дапаможнік

Складальнік: Валошчык Т. С.
Камп'ютарная вёрстка: Валошчык Т. С.

Выдавец: Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №7г.Кобрына»,
вул. Дзяржынскага, 55, г. Кобрын, kbr-sch7@brest.by